ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 84 (4336)
ЧАЦЬВЕР, 14 красавіка 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: Перадавы—Поўнасьцю выканаць плян кантрактацыі тэхкультур—Бальшавіцкая самакрытыка — аснова перабудовы работы БелАПП (2-3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ—Актывізавацца ў барацьбе за суцэльную пісьменнасьць (4-я стар.).

12-ты дзень масавай генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы (1 стар.).

Гаспадарчы развал фашысцкай Польшчы паглыбляецца (1 стар.).

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА—Умацаваць і канкрэтызаваць кіраўніцтва кампаніяй па абмене камсамольскіх білетаў—задача кожнай партыйнай ячэйкі (2 стар.).

ПРОБНЫ РЭЙС РЭЧНЫХ СУДНАЎ БССР—Неадкладна зьнішчыць выяўленыя недахопы (2 стар.).

Браку не выпускаць, бракам не гандляваць (3 стар.).—Менскую арганізацыю Асоавіахіму ператворым ва ўзорны вучастак абарончай работы (3 стар.).

КАНФЭРЭНЦЫЯ ПА «РАЗЗБРАЕНЬНІ» аднавіла сваю «працу» (4 ст.).

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4 стар.).

Поўнасьцю выканаць плян кантрактацыі тэхкультур

БССР зьяўляецца адным з важнейшых ільнаводчых раёнаў Савецкага Саюзу. У 1932 годзе павінна быць засеяна 320 тыс. га ільну і 50 тыс. га канапель. Адным з магутных вагароў, якія забясьпечваюць выкананьне пляну па пасеве тэхкультур, зьяўляецца кантрактацыя. Клясавы вораг прымае ўсе меры да таго, каб сарваць выкананьне пляну пасеву тэхнічных культур. Пры дапамозе сваіх агентаў—апартуністаў кулак агітуе за скарачэньне пасеўных плянаў, вядзе работу з мэтай сарваць выкананьне плянаў па ссыпцы насеньня тэхкультур і імкнецца сарваць арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

У сьвятле гэтых фактаў кантрактацыя павінна быць праведзена, як шырокая масавая гаспадарча-палітычная кампанія, і павінна зьявіцца важнейшым вагаром у барацьбе з кулаком, у барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці тэхкультур і далейшае арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне ільнавочных калгасаў.

Паводле пастановы СНК БССР ад 9 сакавіка сёлета павінна быць закантрактавана па ільне: валакна — 15.300 тон, трасты—92.000 тон, саломы—2.500 тон, ільнянога семя — 31.000 тон. Па канаплях: валакна—2.500 тон, трасты—9.000 тон, саломы—2.400 тон і семя—3.000 тон.

З гэтай колькасьці павінна быць закантрактавана па аднаасобным сэктары (у перавозе па ільнавалакну): па ільне—18,4 проц., ільняным семі—28,7 проц., па канаплях—50 проц. і канапляным семі—33,3 проц. Гэтыя даныя відавочна паказваюць на неабходнасьць напружанай работы ся род аднаасобнікаў і рашучай барацьбы з праяўленьнямі недаацэнкі аднаасобнага сэктару. Задача ўсіх раённых арганізацый заключаецца ў тым, каб на аснове шырокай масавай работы поўнасьцю выканаць плян кантрактацыі і забясьпечыць выкананьне пасеўнага пляну тэхкультур па аднаасобным сэктары.

Ня гледзячы на тое, што з дня апублікаваньня пастановы СНК прайшло больш месяца, а плян цэнтральнымі арганізацыямі былі спушчаны ў раёны 15 сакавіка, кантрактацыя працяглі недазьвольнічна. На 5 красавіка плян выканан па ільне (у перавозе на ільнавалакну)—па 5 проц., ільнасемі—на 4,4 проц., па пяньцы—на 0,45 проц. і канапляным семі — 1,1 проц.

Асноўныя арганізацыі, якія праводзяць непасрэдную кантрактацыю — «Белзагатлён», Трактарацэнтр, ільнапяньковыя заводы не ўзяліся за работу як сьлед. Уся работа ў раёнах і сельсаветах знаходзіцца ўсё яшчэ ў стадыі плянаваньня і заключэньня лёкальных дагавораў. Непасрэдна з пасеўнікамі ніякай работы не вядзецца.

З 9 ільнапяньковых заводаў, якія павінны прыступіць да кантрактацыі на 10 красавіка заключылі дагаворы з райаддзяленьнямі «Загатлён» толькі 5 заводаў — Дрысенскі, Боркавіцкі (Дрысенскага раёну), Шклоўскі, Хоцімскі (Касьцюковіцкага раёну) і Крычаўскі.

З 53 МТС заключылі дагаворы толькі 9.

Ня лепш праводзяць работу і райаддзяленьні «Загатлён», значная частка якіх знаходзіцца на паперы. Усяго аддзяленьняў павінна было быць арганізавана 27, між тым, па сёнешні дзень у 17 раёнах яшчэ ня вылучаны райупаўноважаныя. Раённыя арганізацыі да гэтага пытаньня адносяцца няўважліва. Фактычна аддзяленьні не арганізаваны ў наступных раёнах: Аршанскім, Капыльскім, Смаляніцкім, Лагойскім, Ельскім, Браціпскім, Церахаўскім, Буда-Кашалёўскім, Калінкавіцкім, Камарынскім, Чачэрскім, Хойніцкім, Патрыкоўскім, Нараўлянскім, Жытковіцкім, Лельчыцкім і Тураўскім.

У Аршанскім і Жлобінскім раёнах да сёнешняга дня яшчэ не абмеркаваны пляны кантрактацыі ў раённых арганізацыях і ня спушчаны ў сельсаветы. У Барысаўскім раёне зусім адмовіліся вылучыць актыў для правядзеньня кантрактацыі.

З боку некаторых МТС — Ст.-Дароская, Магілеўская, Вузьдзенская і Пугачынская (Койданаўскі раён) адмаўляюцца заключаць дагаворы, спасылаючыся на недахват кадраў і г. д.

Усе гэтыя факты красамоўна гавораць аб апартуністычнай недаацэнцы гаспадарча - палітычнай кампаніі з боку некаторых раённых арганізацый, наяўнасьці самацёку, нежаданьня працаваць, што і зьяўляецца аспоўнымі прычынамі, якія тармозяць пасьпяховае правядзеньне кантрактацыі.

Вялізарныя грашовыя ўкладаньні ў сельскую гаспадарку, дапамога з боку дзяржавы насеньнем, угнаеньнямі, прадастаўленьне ільгот кантрактантам, павялічэньне завозу прамтавараў у ільнаводныя раёны, здача ўрадкуючы ільну трастой па калгасах на 90 проц. і 10-15 проц. па аднаасобным сэктары і г. д. стварацоць усе ўмовы для яшчэ большага напружаньня пасеўнай плошчы па тэхкультурах і пасьпяховага правядзеньня кантрактацыі. Пераваг, якія прадастаўляюцца кантрактантам тэхкультур, павінны быць скарыстаны для мабілізацыі мас на барацьбу за якасныя паказальнікі, павышэньня ўраджайнасьці, выхаду таварнай прадукцыі, выканаьня і перавыканаьня сваіх абавязкаў, узятых кантрактантамі перад дзяржавай.

Ільназаводы павінны разгарнуць бальную работу па кантрактацыі і забясьпечыць сабе сырцовую базу. Усякае пажаданьне весьці работу ў гэтай галіне з боку аднаасобных работнікаў ільнапяньказаводаў павінна разглядацца, як апартуністычная недаацэнка забясьпячэньня заводу сырцом.

Асноўныя арганізацыі, якія вядуць кантрактацыю — аддзяленьні «Загатлён», МТС і ільнапяньказаводы павінны быць сапраўднымі арганізатарамі кантрактацыі, як масавай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Задача раённых арганізацый на аснове шырокай масавай работы сярод калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў неабходна дабіцца таго, каб кантрактацыя тэхкультур была скончана ў максымальна кароткі тэрмін. Усякаму імкненьню кулака і яго агентаў—апартуністаў перашкодзіць пасьпяховаму правядзеньню барацьбы па вырашэньні праблемы тэхкультур і сарваць кантрактацыю павінен быць дан рашучы адпор. Папулярызацыяй усіх ільгот кантрактантам, разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва змагацца за кантрактацыю, як магутны вагар арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і поўнае выкананьне пасеўных плянаў.

12-ты ДЗЕНЬ МАСАВАЙ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ ДА СЯЎБЫ

ПА ПРЫКЛАДЗЕ САЎГАСАЎ „НЕГАРЭЛАЕ“ І „АСТРАГЛЯДЫ“ УСЕ САЎГАСЫ БССР ПАВІННЫ РЫХТАВАЦЦА ДА СЯЎБЫ

У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ СКОНЧЫЦЬ РАМОНТ ТРАКТАРАЎ І СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ МАШЫН У МТС, САЎГАСАХ, КАЛГАСАХ І У АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ

Апошнія весткі з пасеўнага фронту

У Лельчыцкім раёне пачынаецца масавая сяўба

ЛЕЛЬЧЫЦЫ. (Па тэлеграфу).

Лельчыцкі раён распачаў сяўбу. Калгасамі ўзарана 30 га, аднаасобнікамі—45 га. Засеяна ў раёне 11 га збожжавых.

14 красавіка па раёне разгортваецца масавая сяўба.

Змагацца за скарочаныя тэрміны сяўбы

БРАГІН. Самаправераччныя брыгады жывёлагадоўчага саўгасу «Астраглядзі» праверылі гатоўнасьць гаспадаркі да выхаду ў поле.

Саўгас забясьпечан насеньнем на 90,5 проц. Гародных культур у саўгасе ёсьць лішкі, якія перададны Малакапрамтрэсту. Недахват насеньня тлу мачыцца значным пашырэньнем пасеўнай плошчы. Калі ў мінулым годзе саўгас сеяў яравых 151 га, дык у гэтым ён засявае 304 гэктары. Амаль усё насеньне сабрана з уласных рэсурсаў. Нехапаючае насеньне саўгас атрымае ад суседніх саўгасаў.

Насеньне ўжо ачышчана і пратручана. Сельска-гаспадарчы інвэнтар і збруя адрамантаваны.

У саўгасе арганізавана 10 брыгад, да кожнай з іх даведзен вытворчы плян. Пры абмеркаваньні вытворчага заданьня ў брыгадах высоўваліся сустрэчныя пляны. Так, паляводчыя рабочыя абавязаліся засеяць авёс у 9 дзён, замест вызначаных 10 дзён, буль бу—у 13 дзён, замест 14; канюшыну—за 10 дзён, замест 12, паводле пляну.

Саўгас рэалізуе ўмовы т. Сталіна аб арганізаваным наборы рабочай сілы. Зараз у саўгасе ёсьць 104 пастаянныя рабочыя. З суседнімі калгасамі заключаны дагаворы па сэзонных рабочых.

Рабочыя абавязаліся дабіцца ўзьняцьця ўраджайнасьці — замест 7,7 цэнтн. збожжавых, атрыманых у мінулым годзе, яны пастанавілі змагацца за 16 цэнтн., бульбы—за 140 цэнтн., замест 85 у мінулым годзе.

Для атрыманьня запраектаванага ўраджаю ў саўгасе ўстаноўлены жорсткія тэрміны сяўбы. Амаль увесь гной ужо вывезен і закладзен. Цягавая сіла забясьпечана кармамі на ўвесь час палявых работ.

Для стварэньня ўласнай кармовай базы 50 проц. яравога кліну будуць засеяны кармавымі культурамі.

90 проц. рабочых пераведзены на зьдзельшчыну, што дапамагло ліквідацыі ўраўнілаўкі. Кваліфікаваны каваль у сярэднім выпрацоўвае 5 р. у дзень, чорнарабочы—1 р. 96 к. Даглядчыца цялят раней атрымлівала 37 р., зараз—51 р.

Дырэкцыя клапоціцца аб паладжваньні грамадзкага харчаваньня. Пры сталоўцы арганізован сьвінаадкормачны пункт, дзе пастаўлена на адкорм 23 сьвіньні.

Пры замацаваньні дасягнутых посьпехаў саўгас выйдзе пераможцам на фронце трэцяй бальшавіцкай вясны.

Марціненка, Пароцкі.

Узьняцьцем ураджайнасьці—стварыць кармовую базу

Яравы клін сьвінагадоўчага саўгасу **«Негарэлае»** цягнецца ўздоўж самых пагранічных слупоў. На ўзгорках зняла ўжо падсохла. Рабочыя скарыстоўваць добрае падвор'е, якое ўстанавілася за апошнія дні і ўжо зааралі першыя 8 гэктараў.

Саўгас ставіць у гэтым годзе перад сабой адказьнейшую задачу—поўнасьцю забясьпечыць уласнымі кармамі свае 2-х-тысячнае стада, рагатую жывёлу і коняй. Гэту задачу можна вырашыць толькі ўзьняцьцем ураджайнасьці, раньняй сяўбой і поўным скарыстаньнем угнаеньняў.

Саўгас пачынае сяўбу ўзброеным і падрыхтаваным. Насеньне поўнасьцю ўжо адсартавана. Тры трактары і ўвесь інвэнтар адрамантаваны. Коні знаходзяцца ў добрым стане і забясьпечаны кармамі на ўвесь час палявых работ. Вось ужо некалькі дзён, як коням дана перадышка перад выхадам у поле.

Дырэкцыя памятае, што без угнаеньня глебы нельга дабіцца ўзьняцьця ўраджайнасьці. 3.600 вазоў гною ўжо вывезены на поле, таксама як і фасфарытчае ўгнаеньне. Амаль увесь яравы клін будзе ўгноен.

Рабочая сіла разьбіта на брыгады, якія прымацаваны да поўных палявых вучасткаў. Інвэнтар і коні прымацаваны да брыгад. Вытворчае заданьне прапрацавана ў кожнай брыгадзе і даведзена да кожнага рабочага.

Рабочай сілай саўгас забясьпечан. У гаспадарцы занята 175 пастаянных рабочых. Праўда, у такі напружаны момант сяўбы, як пасадка бульбы — ня хопіць каля 50 чалавек. На агульным сходзе рабочыя пастанавілі папоўніць гэты недахват за лік членаў сем'яў рабочых.

Арганізацыяй грамадзкага харчаваньня саўгас можа служыць прыкладам для іншых. Дырэкцыя ўвесь час клапоціцца аб сталоўцы. На цэлы месяц сталоўка ўжо забясьпечана мясам.

Праз дзень-два ў саўгасе разгорнецца сяўба. Слабым месцам у падрыхтоўцы зьяўляецца ўлік. Рахункаводчы апарат саўгасу надзвычай слабы і ня можа паладзіць аперацыйнага штодзённага ўліку.

Сьвінагадоўчы трэст тэрмінова павінен дапамагчы саўгасу ўмацаваць гэта адказьнейшае зьвяно палявых работ.

Б-ін.

Барысаўскія прыгарадныя гаспадаркі спадзяюцца на... біржу працы

БАРЫСАЎ. (Наш кар.).

Прыгарадныя фэрмы Барысаўскага раёну ў гэтым годзе павінны засеяць больш паўтары тысячы га ўсякіх плодагародных культур. Між тым справа з забесьпячэньнем насеньнем фэрм стаіць надзвычай дрэнна. З патрэбных 208 тон раньняй бульбы ёсьць толькі каля 80. Асобныя фэрмы зусім яе ня маюць.

Ня лепш і з вываззкай гною. На 1 красавіка вывезена 50 проц. гною. Штучнага ўгнаеньня зусім няма.

На фэрме Белкаапсаюзу ёсьць 1 трактар і 110 коняй. Гэта цягавая сіла ня можа забясьпечыць выкананьня ў тэрмін плянаў сяўбы. Яшчэ ў лістападзе заплачана Трактарацэнтру за 3 трактары, але яны да гэтага часу не атрыманы. Такое-ж становішча і на другой фэрме Белкаапсаюзу, у якой замест патрэбных 125 коняй ёсьць 34.

Прыямінскай і Стара Барысаўскай фэрмам патрэбна ў часе веснавой сяўбы 400 пастаянных рабочых, а ёсьць на сёнешні дзень у Стара-Барысаўскай—47 чал. і ў Прыямінскай—50 чал. Дагаворы з калгасамі да гэтага часу не заключаны. Ніякай работкі рабсілы не вядзецца Кіраўніцкі фэрм спадзяюцца на прысылку рабочай сілы з... біржы працы і ніякіх захадаў да забесьпячэньня гаспадарак рабочай сілай ня прымаюць.

Грамадзкае харчаваньне на фэрмах зусім не падрыхтавана да прыёму новых рабочых. Сталовая пры Стара-Барысаўскай фэрме можа забясьпечыць толькі 150 чал., а будзе працаваць каля 300 рабочых. У Прыямінскай фэрме кухня прыстасавана да прыёму толькі 50 чал., а трэба—170 чал.

Да пачатку сяўбы засталіся лічаныя дні. Неабходна зараз-жа ўзяцца за вярбоўку рабочай сілы, за падрыхтоўку сталовых, за атрыманьне насеннай бульбы, каб забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў сяўбы.

Нэйдлін.

Аднаасобны сэктар—найбольш адсталы вучастак

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.).

На працягу трох апошніх пяцідзенак справа з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы ня рухаецца з месца. Ход ссыпкі насенных і страхавых фондаў і ачысткі насеньня далёка не забясьпечвае 100 проц. выкананьня пасеўных плянаў.

У калгасах ссыпана бульбы 65 проц., збожжавых—62 проц., тэхнічных культур—41 проц., страхфондаў ссыпана: па збожжавых—67%, па тэхкультурах—23 проц., ачышчана 55 проц. патрэбнай колькасьці насеньня. Рэалізацыя насеннай пазыкі праходзіць самацёкам.

Значна горш з падрыхтоўкай да сяўбы ў аднаасобным сэктары. Не ад рамантаваны 1.194 плугі, 1.102 калёсы, страхавыя фонды па аднаасобным сэктары ссыпаны толькі на 27 проц. па збожжавых і на 11 проц. па тэхнічных культурах.

Гэтыя ганебна марудныя тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы тлумачацца адсутнасьцю масавай работы на месцах, дрэнным скарыстаньнем мясцовага актыву.

3-га красавіка раён уключыўся ў генэральную праверку. На месцы пакіроўан рённы актыў.

К.

Вузьдзенскі раён напярэдадні масавай сяўбы

ВУЗДА. (Па тэлеф.).

Учора (13 красавіка) выехалі ў поле калгасы **«Камунар», імя Сталіна**, Камяноцкага сельсавету. 14 красавіка выяжджае ў поле калгас імя **29 жніўня**.

Вузьдзенскі раён напярэдадні масавай сяўбы, гэтаму спрыяюць клімаматычныя і асабліва глебавыя ўмовы пераважнай колькасьці сельсаветаў раёну.

Чыкун.

* * *

СТАРОБІН.

Усе калгасы Лістападаўскага сельсавету выйшлі ў поле. Прыступаюць да палявых работ калгасы і іншых сельсаветаў.

Крапіўка.

Калгасы Случчыны пачалі палявыя работы

СЛУЦАК. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). КАЛГАСЫ СЛУЦКАГА РАЁНУ ПАЧАЛІ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ.

КАЛГАС ІМЯ КАРЛА ЛІБКНЭХТА ЗААРАЎ ПАД ЯРАВУЮ ПШАНІЦУ 55 ГЭКТАРАЎ.

ХАРЫТОНЧЫК.

Ліквідаваць разрыў паміж рамонтам трактараў і прычапнога інвэнтару

Апошняя зводка НКЗБ сыгналізуе нам аб замарудзваньні тэмпаў і зьніжэньні якасьці рамонту трактараў і с.-г. машын. Ня гледзячы на тое, што рад раёнаў прыступілі ўжо да палявых работ, па 5 красавіка плян рамонту па БССР па трактарах выканан усяго толькі на 80,8 проц., трактарных плугох—на 67,5 проц., конных плугох—62,4 проц., сяварках—71,1 проц. і калёсах — 50,2 проц.

Саўгасы і МТС яшчэ ня скончылі рамонту. Тут мы маем вельмі вялікі разрыў паміж рамонтам трактараў і прычапнога інвэнтару. Калі плян рамонту трактараў выкананы на 82,8 проц., дык па трактарных плугох—на 67,5 проц. і сяварках — 74,6 проц. Гэта становішча стварае сур'ёзную пагрозу і можа выклікаць затрыманьне палявых работ, калі трактарная цяга ня будзе нагружана з-за несваячасовага рамонту прычапнога інвэнтару.

Яшчэ горш праходзіць рамонт па аднаасобным сэктары. Па конных плугох плян выканан толькі на 49,1 проц., па калёсах—на 36,7 проц. Гэтыя лічбы зьяўляюцца сьведкамі таго, што ў радзе раёнаў арганізацыя рамонту па аднаасобным сэктары ігнаруецца.

Якасьць рамонту трактараў прымушае жадаць шмат лепшага. За апошні час лік забракаваных трактараў павялічваецца. Калі з агульнага ліку адрамантаваных трактараў па МТС па 25 сакавіка было забракавана 30 трактараў, дык па 1 красавіка забракован 31 трактар, а па 10—32.

Неабходна ў бліжэйшыя дні значна ўзмацніць тэмпы рамонту, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якасьць. Арганізаваць рамонт па аднаасобным сэктары і паклясьці канец апартуністычнай недаацэнцы, якая існуе ў радзе раёнаў. Уся трамадзкасьць рамонтных майстэрань павінна быць мабілізавана на ўдарнае правядзеньне рамонтнай кампаніі. **Ні аднаго трактара і с.-г. машыны да пачатку масавай сяўбы—не адрамантаваных.** На аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна ў рабоце майстэрань, у бліжэйшыя дні скончыць рамонт.

Зводка НКЗБ

аб ходзе рамонту трактараў і с.-г. інвэнтару па БССР на 5-IV—1932-г.

ВЫКАНАНЬНЕ У ПРОЦАНТАХ ДА ПЛЯНУ

Назва саўгастрэстаў і с.-г. сыстэмы	Трактары	Плугі тракт.	Плугі конныя	Сяварыі	Калёсы
Малпрамтрэст	91,3	89,2	97,5	90,8	98,9
Садгародтрэст	90,7	89,2	100	77,8	58,8
Птушкатрэст	83,3	100	100	93,3	80,5
Ільнатрэст	39,4	58,6	—	86,4	—
Саўгас імя Х-цігодзьдзя БССР	84,0	100	—	—	—
Насентрэст	89,9	94,2	93,8	82,2	78,7
Лугтрэст	47,7	80,0	—	94,7	80,0
Сьвінатрэст	89,5	76,2	80,7	88,4	—
Белсельаб'яднаньне	48,0	50,0	88,4	86,7	34,8
С.-г. калёніі НКЮ	—	—	87,0	50,0	41,2
Саўгасы ДПУ	28,6	—	100	100	100
Бульбяная станцыя	50,0	—	90,5	100	91,7
Плодагародная станцыя	100	—	100	66,7	86,2
Трактарацэнтр	88,6	58,2	—	39,9	—
Разам па дзяржсэктары	82,8	67,5	90,0	74,6	79,7
Па калгасах	53,8	—	70,8	71,7	57,6
Па аднаасобным сэктары	—	—	49,1	—	36,7
Разам па БССР	80,8	67,5	62,4	72,1	50,2
Было па 31-III—1932 г.	80,6	66,5	61,6	72,5	50,2

Уключыліся ў генэральную праверку

КАМАРЫН (БЕЛТА). Раён уключыўся ў генэральную праверку падрыхтаванасьці да сяўбы. У калгасы і сельсаветы накіравана 40 чал. партыйнага актыву.

* * *

СІРОЦІНА (БЕЛТА). Раён з вялікім спазьненьнем уключыўся ў генэральную праверку гатоўнасьці да сяўбы. Толькі 6 красавіка 15 чал. раённага актыву выехала ў сельсаветы для арганізацыі самаправераччных брыгад у калгасах і ў аднаасобным сэктары.

* * *

ХОЙНІКІ. Хойніцкі раён уключыўся ў генэральную праверку. Для правядзеньня праверкі ў сельсаветы выехалі брыгады.

Пытаньне аб праверцы абгаворана на парадзе сакратароў камсамольскіх ячэек.

Кампанія падрыхтоўкі абмену камсамольскіх білетаў скарыстана ў Хойніцкім раёне для яшчэ большай мабілізацыі камсамольскіх мас на баявое правядзеньне генэральнай праверкі гатоўнасьці да сяўбы.

Кароль К.

* * *

РЭЧЫЦА. Рэчыцкі раён уключыўся ў масавую генэральную праверку падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы. У праверку ўключыліся ўсе раённыя арганізацыі. Складзен раённы штаб.

На раён накіравана 70 чал. брыгадзіраў партыйна-камсамольскага, прафэсіянальнага актыву і рабселькораў. Накіравана 80 чал. пастаўнікаў гораду.

Рэдакцыяй «РП» выпускаецца спэцыяльны бюлетэнь, прысьвечаны праверцы. Пасылаюцца 3 выязныя рэдакцыі «РП». На мясцох праводзяцца куставыя нарады рабселькораў і калгаснікаў па ўключэньні ў генэральную праверку.

Рэдакцыя «РП»—Фішбэйн.
Райза—Рамоў.
РКК-РСІ—Маложын.

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. Пытаньні праверкі абгаворана на парадзе старшынь калгасаў. Для кіраўніцтва і правядзеньня праверкі 28 чал. з раённага, партыйнага і прафэсіянальнага актыву накіраваны да 15 красавіка ў сельсаветы.

Старшыня райштабу МІРОНЕНКА.

Калі ў калгасы будзе завезена атрута для пратручваньня насеньня?

Чакаем тэрміновага адказу Наркамзему БССР

КРЫЧАЎ. (Брыгада «Зьвязды»).

Адным з аграмерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці зьяўляецца пратручваньне насеннага матар'ялу, якое ўзьнімае ўраджайнасьць на 10-15 проц.

З лепшых спосабаў пратручваньня насеньня лічыцца сухое пратручваньне, або апылкаваньне, якое робіцца адразу пасьля ачысткі і не патрабуе наступнага мокрага пратручваньня. Сухое пратручваньне дае магчымасьць пазбавіцца галаўні, на якую хварэюць сельска-гаспадарчыя расьліны, асабліва авёс, ячмень, пшаніца і проса. Расьліны, якія хварэюць на гэту хваробу, даюць ураджай на 10-15 проц., у паасобных выпадках —50 проц. ніжэй нармальнага.

На барацьбу з гэтай хваробай павінна быць зьвернута асаблівая ўвага. Але гэта мерапрыемства зусім недаацэнена крычаўскім райза і райкалгассаюзам, якія да гэтага часу не правялі падрыхтоўчай працы. У гэту справу ня ўцягнуты камсамольскія ячэйкі Асоавіяхіму, якія павінны зьявіцца ініцыятарамі барацьбы, і не мабілізаваны калгасныя масы. Райсавет Асоавіяхіму лічыць, што яго гэта справа не датычыць.

Райкалгассаюзам у апошні час былі прыняты наступныя меры. Па калгасах 25 сакавіка была разаслана наступнага зьместу адносіна:

«Неабходна падрыхтавацца да пратручваньня насеньня сухім і мокрым спосабам. У апошнім паведамленьні будзе ўказана, калі прыбыць за атрыманьнем атруты».

Пазьней-жа, 2 красавіка, па калгасах разаслана інструкцыя, як пратручваць насеньне сухім і мокрым спосабам, але атрута не завезена ў раён і калгасы і да гэтага часу. Ёсьць пагроза зрыву выкананьня пляну пратручваньня насеньня, асабліва сухім спосабам.

Патрэбны неадкладныя меры да забесьпячэньня калгасаў сродкамі па сухім пратручваньні (парыская зелень) і мабілізацыі мас вакол гэтага пытаньня.

ГАСПАДАРЧЫ РАЗВАЛ ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ ПАГЛЫБЛЯЕЦЦА

20 кілёмэтраў вагонаў бяз руху

ВАРШАВА, 11. Гаспадарчы развал фашысцкай Польшчы выклікаў адначасова і тэхнічны рэпрэс. Рэпрэс гэты праяўляецца ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі Польшчы. На вёсцы сяляне, разбураныя эканамічнай палітыкай фашысцкай дыктатуры, варочаюцца да першабытных форм працы. Ужываньне штучных угнаеньняў нават у перагавых зямляробчых раёнах Польшчы ўпала да мінімуму. Сяляне масамі варочаюцца ад плуга да старажытнай сахі.

У краіне замірае жыцьцё. Цягнікі ходзяць пустымі, а людзі — сотні вёрст ходзяць пехатой. Крызіс гасіць сотні паравозных топак, выводзіць у «бестэрміновы водпуск» тысячы вагонаў.

Так на рэйках паміж **Мінскам-Мазавецкім** (каля Варшавы) і **станцыяй Тлушчам на працягу 20 клм.**—паведамляе пэпэсэаўскі «Роботнік» — **стаяць бяз руху нікому непатрэбныя вагоны.**

Каля станцыі **Скаржыска стаяць 50 зусім новых высокаякасных паравозаў.**

Францускі імпэрыялізм дамагаецца „унутранога ўціхаміраньня“ Польшчы

ВАРШАВА, 7. «Кур'ер Львоўскі» паведамляе падрабязнасьці парады, якая адбылася некалькі дзён назад у польскага прэзыдэнта. На парадзе абгаворвалася пытаньне аб перагаворах польскага міністра замежных спраў Залескага з францускім прэм'ерам Тардзе адносна заключэньня пазыкі ва Францыі для Польшчы. Згодна гэтаму паведамленьню Тардзе быццам настойваў на тым, каб упесьці «ўціхаміраньне ва ўнутранае становішча Польшчы». У сувязі з гэтым прэзыдэнт прапанаваў даручыць віцэміністру Завадзкаму пачаць перагаворы з так званымі «левымі» групоўкамі і, **у прыватнасьці, з ППС.** (ТАСС).

Італьянская забастоўка

ВАРШАВА, 10. Ва Львове ў друкарні украінскага мітрапаліта Шэптыцкага «Біблёс» выбухнула італьянская забастоўка. Рабочыя пакінулі працу, але ня выходзілі з прадпрыемства. Паліцыя пасьля некалькіх дзён бабастоўкі па загаду **Шэптыцкага сілай выгнала бастуючых, зьбіваючы іх і арыштоўваючы кіраўнікоў.**

Абураныя рабочыя арганізавалі дэманстрацыю, **выбіваючы каменьнямі шыбы ў палацы мітрапаліта Шэптыцкага і ў кватэры дырэктара друкарні.**

КАНФІСКАЦЫЯ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ПРЭСЫ ВА ЛЬВОВЕ

ВАРШАВА, 11. З Львову паведамляюць што там па загаду паліцэйскіх улад канфіскаваны украінскія рабоча-сялянскія газэты «Сельроб» і «Сила», а таксама орган пралетарскіх пісьменьнікаў Заходняй Украіны, літаратурная часопісь «Вікна».

Памяці бальшавіка-вучонага

АД ПРЭЗЫДЫУМУ КАМУНІСТЫЧНАЙ АКАДЭМІІ

Памёр Міхаіл Мікалаевіч Пакроўскі—заснавальнік і нязьменны старшыня Камуністычнай Акадэміі, валяючы гісторык-ленінец, пястомны змагар за марксыцка-ленінскую тэорыю, за бальшавіцкую партыйнасьць у навуцы.

На працягу ўсёй сваёй рэвалюцыйнай дзейнасьці М. М. ніколі не замыкаўся ў рамкі габінэтнай навуковай работы, будучы ня толькі гісторыкам пралетарскай рэвалюцыі, але і актыўным удзельнікам дзьвёх нашых вялікіх рэвалюцый—1905 і 1917 г. г. — і сацыялістычнага будаўніцтва СССР, змагаром за генэральную лінію партыі.

У асобе М. М. Пакроўскага зыходзіць у магілу адзін з лепшых прадстаўнікоў старой ленінскай гвардыі, буйнейшы вучоны-бальшавік і пястомны арганізатар на фронце асьветы і марксыцка-ленінскай навукі.

Прэзыдыум Камуністычнай Акадэміі, увесь яе склад і навуковыя супрацоўнікі, схіляючы галовы перад магілай свайго кіраўніка, таварыша і прыяцеля, абяцаюць усе свае сілы аддаць барацьбе за справу камунізму, якой так сама аддана служыў тав. М. М. Пакроўскі.

Ад прэзыдыуму Камуністычнай Акадэміі: М. Савельеў, В. Мілюцін, Е. Пашуканіс, Е. Варга, Н. Лукін, К. Астравіцянаў.

Пахаваньне М. М. Пакроўскага

Пасьля крэмацыі, якая адбылася ўноч па 13 сакавіка, урна з прахам Пакроўскага была пастаўлена ў залі Массавету. На працягу дня міма ўрны прайшло мноства рабочых, вучняў, навуковых, партыйных і грамадзкіх работнікаў.

У гапаровай варце ля праху М. М. пазьменна дзяжурылі яго прыяцелі і вучні. У апошнюю зьмену ў гапаровай варце стаялі **Куйбышаў, Яраслаўскі, Рыкаў, Арджанікідзэ, Енукідзэ, Мікаян, Мілюцін і інш.**

У 16 гадзін **Куйбышаў, Арджанікідзэ, Савельеў, Пашуканіс, Мілюцін, Бухарын, Яраслаўскі, Енукідзэ** выносьлі ўрну з будынку Массавету. Пахавальная процэсія, якая суправаджалася піматлікімі дэлегацыямі, на кіравалася да Краснага пляцу. Урна з прахам была ўстаноўлена перад маўзалеем Леніна.

На трыбуне маўзалею **т. т. Сталін, Молатаў, Калінін, Варашылаў, Рудзутак, Андрэеў, Арджанікідзэ, Мікаян, Куйбышаў, Енукідзэ, Бухарын, Яраслаўскі і інш.** На жалобным мітынгу ад імя ЦК УсесКП(б) выступіў т. **Бухарын,** які ахарактарызаваў выдатную ролю Пакроўскага, як вернага байца партыі, актыўнага рэвалюцыянэра-арганізатара і сусьветнага вучонага.

Ад імя ЦВК і СНК СССР выступіў т. **Куйбышаў.** Потым т. т. **Сталін, Молатаў, Варашылаў, Калінін, Енукідзэ, Арджанікідзэ, Мікаян і Яраслаўскі** перанесьлі ўрну да Крамлёўскай сьцяны, дзе яна была ўмуравана побач з урнамі Красіна, Цурупы, Сверлова-Сьвярдлова, Лепсэ, Ларына і Отучкі. Тры гарматныя залпы аддалі апошні салют нябожчыку.

Калгасы Случчыны будзе завезена атрута для пратручваньня насеньня?

Чакаем тэрміновага адказу Наркамзему БССР

КРЫЧАЎ. (Брыгада «Зьвязды»).

Адным з аграмерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці зьяўляецца пратручваньне насеннага матар'ялу, якое ўзьнімае ўраджайнасьць на 10-15 проц.

З лепшых спосабаў пратручваньня насеньня лічыцца сухое пратручваньне, або апылкаваньне, якое робіцца адразу пасьля ачысткі і не патрабуе наступнага мокрага пратручваньня. Сухое пратручваньне дае магчымасьць пазбавіцца галаўні, на якую хварэюць сельска-гаспадарчыя расьліны, асабліва авёс, ячмень, пшаніца і проса. Расьліны, якія хварэюць на гэту хваробу, даюць ураджай на 10-15 проц., у паасобных выпадках —50 проц. ніжэй нармальнага.

На барацьбу з гэтай хваробай павінна быць зьвернута асаблівая ўвага. Але гэта мерапрыемства зусім недаацэнена крычаўскім райза і райкалгассаюзам, якія да гэтага часу не правялі падрыхтоўчай працы. У гэту справу ня ўцягнуты камсамольскія ячэйкі Асоавіяхіму, якія павінны зьявіцца ініцыятарамі барацьбы, і не мабілізаваны калгасныя масы. Райсавет Асоавіяхіму лічы

Партыйнае будаўніцтва

УМАЦАВАЦЬ І КАНКРЭТЫЗАВАЦЬ КІРАЎНІЦТВА

КАМПАНІЯЙ ПА АБМЕНЕ КАМСАМОЛЬСКІХ БІЛЕТАЎ— ЗАДАЧА КОЖНАЙ ПАРТЫЙНАЙ ЯЧЭЙКІ.

Арганізаваць сыстэматычную праверку выкананьня

Задача кампаніі па абмене камсамольскіх білетаў заключаецца ў тым, каб «узьняць клясавую баяздольнасьць саюзу, павысіць ідэйны палітычны ўзровень саюзу на большую вышыню — вось палітычны бок абмену камсамольскіх білетаў». Падрыхтоўчая работа па **Крычаўскай** раённай арганізацыі камсамолу была праведзена яўна нездавальняюча, не мабілізавала грамадзкая думка камсамольцаў на правядзеньне гэтай важнай палітычнай кампаніі.

Парт'ячэйкі раёну ў большасьці выпадкаў аднесьліся пляўважліва, а частка зусім фармальна да абмену камсамольскіх білетаў. Яркім прыкладам таго, наколькі слаба праведзена падрыхтоўчая работа да абмену камсамольскіх білетаў, служаць наступныя факты. **Касьцюковіцкая** камсамольская ячэйка не праводзіла ніякай работы, у выніку агульныя сходы па абмене камсамольскіх білетаў два разы зрываліся. У **Бацьвінаўскай** ячэйцы сакратар тав. **Сінколікаў**, робячы інфармацыю аб абмене білетаў, неправільна арыентаваў камсамольцаў. Гэта ячэйка вынесла пастанову: «Слухалі інфармацыю т. Сінколка аб абмене камсамольскіх білетаў. Пастанавілі: **прапанаваць камсамольцам унесьці па 25 кап. за новыя білеты».**

У гэтай пастанове выразна відаць неразуменьне палітычнай сутнасьці спрэны, тэндэнцыя зьвесьці абмен камсамольскіх білетаў выключна да тэхнічнага боку. Другі бок скажэньня сутнасьці абмену камсамольскіх білетаў з боку раду ячэек Крычаўскага раёну заключаецца ў тэндэнцыі ператварыць абмен камсамольскіх білетаў у чыстку. Так, у Бацьвінаўскай ячэйцы ЛКСМБ **прадстаўнік парт'ячэйкі** заявіў: **«Да таго часу ня прыду на агульны сход камсамолу, пакуль вы ня вычысьціце з камсамолу паловы ячэйкі».** Цэх'ячэйка электрастанцыі цэмэнтнага заводу свой агульны сход ператварыла ў пасяджэньне камісіі па чыстцы камсамольскай арганізацыі.

Можна было-б падаць яшчэ шмат фактаў, якія сьведчаць аб перагібах у кампаніі па абмене камсамольскіх білетаў, але і гэтага даволі, каб паказаць, што ў Крычаўскай арганізацыі камсамолу ня ўсе зьвены правільна зразумелі палітычную сутнасьць кампаніі. Парткіраўніцтва ходам гэтай кампаніі застаецца яўна нездавальняючым. Такое становішча не магло не адбіцца на абмене камсамольскіх білетаў. Толькі ў апошні час, калі прыехалі прадстаўнікі ЦК камсамолу і непасрэдна ўмяшаўся райком партыі, памеціўся пекаторы пералом у большасьці ячэек ЛКСМБ і ўзьнялася ўвага парт'ячэек да работы камсамолу.

Частка камсамольскіх калгасных ячэек па-сапраўднаму паказваюць узоры бальшавіцкай барацьбы да выхаду ў поле. Камсамольская ячэйка калгасу імя **Леніна** ў дэкадзік па ліквідацыі недахопаў да выхаду ў поле ўзяла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў. Створана брыгада па вывазцы гною, група дзяўчат узяла абавязацельства выткаць палатно на мяшкі для веснавой сяўбы. У тэй-жа ячэйцы камсамольцы арганізавалі брыгаду па вывазцы вашы.

Ячэйка калгасу «На варце» рэалізавала сваімі сіламі аблігацый сярод калгасьнікаў больш чым па 10.000 кгр. рознага насеньня. На цэмэнтным заводзе 80 камсамольцаў пры актыўным удзеле беспартыйнай моладзі ўзялі на сябе канкрэтныя абавязкі па ўзьнаўленьні прадукцыйнасьці працы. Створаны тры гаспадарча-разрахунковыя камсамольскія брыгады і рад аператыўна-пляновых груп.

Зараз намеціўся некаторы пералом у галіне палітвучобы. Камсамольская арганізацыя Крычаўшчыны бязумоўна зьяўляецца здаровай, здольнай ажыцьцяўляць лінію партыі. Кіраўніцтва з боку райкому камсамолу ячэйкамі не заўсёды было выразнае і канкрэтнае. Новае кіраўніцтва павінна па-баявому выправіць недахопы ў рабоце камсамольскай арганізацыі, наладзіць сыстэматычную праверку выкананьня дырэктыў і самаабавязацельстваў, узятых камсамольцамі і ячэйкамі ў часе абмену білетаў.

Джэлюк.

Выправіць памылкі

Слуцкая камсамольская арганізацыя правядзеньне абмену камсамольскіх білетаў у асноўным скончыла. Папярэднія вынікі праверкі правядзеньня гэтай кампаніі гавораць аб тым, што рад камсамольскіх ячэек раёну, пад кіраўніцтвам мясцовых партарганізацый, правялі абмен білетаў пад знакам мабілізацыі шырокіх камсамольскіх мас на барацьбу за павышэньне колькасных і якасных паказальнікаў на вытворчасьці.

Камсамольская ячэйка буйнейшага ў раёне сьвінагадоўчага саўгасу «Брашчыцы» яшчэ ў пачатку разгортваньня падрыхтоўкі да абмену білетаў узяла на сябе рад практычных самаабавязацельстваў. Камсамольцы паставілі перад сабой задачу за час падрыхтоўкі і правядзеньня кампаніі абмену зьнізіць адыход маладняка ў сьвінагадоўчай фэрме з 15 да 8 проц. Гэта задача Бранчыцкай камсамольскай арганізацыяй ажыцьцёўлена. Пры штодзённай канкрэтнай дапамозе і кіраўніцтве партыйнай ячэйкі камсамольцы саўгасу рашуча ўзяліся за ажыцьцяўленьне па сьвінгазводзе 6 умоў тав. Сталіна, за правільную арганізацыю догляду маладняка.

У тых сельсаветах, дзе партыйныя ячэйкі не зразумелі сутнасьці кампаніі абмену білетаў, ня прымалі ўдзелу ў не правядзеньні дапушчаны скажэньні. Ячэйка калгасу «Прагрэс» (Серадзінкоўскі сельсавет) выключыла 6 камсамольцаў «за неактыўнасьць».

Пры ўдзеле сакратара партыйнай ячэйкі тав. Цыбульніна, па яго ўказаньні выключаны з камсамолу чатыры рабочыя толькі за тое, што яны несвая часова выплацілі членскія ўзносы, а часамі не наведвалі сходу.

Дапушчаныя памылкі трэба выправіць.

Б. Харытончык.

На дасягнутым не спы няцца

Вушацкі раённы камітэт партыі не аддаў належнай увагі кампаніі абмену камсамольскіх білетаў, абмежаваўся толькі тым, што разаслаў дырэктыўны ліст партыйным ячэйкам. Якія мерапрыемствы прынялі партыйныя ячэйкі па гэтым лісьце, РК гэта не цікавіла. У выніку многія парт'ячэйкі ня прымалі ніякага ўдзелу ў правядзеньні гэтай кампаніі.

Райком ЛКСМБ прапампаваў пячаткай білеты, разаслаў па камсамольскіх ячэйках для перадачы, ня даўшы выразных установак. Таму камсамольскія ячэйкі МТС і ШКМ абмен білетаў фактычна ператварылі ў чыстку ячэек з апросам на сходзе аўтабіяграфій і інш. Памылкі гэтых ячэек ня былі своечасова ўлічаны, многія ячэйкі КП(б)Б і ў далейшым ня цікавіліся ходам абмену білетаў.

Пасьля таго, як былі выпраўлены памылкі пры актыўным удзеле прадстаўнікоў ЦК ЛКСМБ, рад камсамольскіх ячэек павысілі свой удзел у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. За гэты перыяд сіламі камсамольцаў у 23 калгасах ачышчана насеньне, сабрана 15 тон попелу, у 9 калгасах адраманто-ван інвэнтар («Новы шлях», «Парыская камуна» і інш.), у 15 калгасах арганізаваны аграгурткі, рэалізавана 150 аблігацый насеннай пазыкі. Навучана 36 брыгад на лесарастрыгаўкі і лесавывазку ў складзе 207 чал.

М. С.

ПРЫ ЎЗЬНЯТАЙ АКТЫЎНАСЬЦІ

Камсамольская арганізацыя Бабруйшчыны ў часе падрыхтоўкі і правядзеньня абмену камсамольскіх білетаў дабілася значных посьпехаў у справе павялічэньня свайго ўзелу ў барацьбе за прамфінплян і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

На дрэваапрацоўчым камбінаце камсамольскі калектыў шырока разгарнуў работу ў цэхах па зборы рацыяналізатарскіх прапаноў, у выніку чаго сабрана 35 каштоўных прапаноў. Пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі камсамольцы беларэўнага цэху разгарнулі работу па ажыцьцяўленьні ўказаньняў тав. Сталіна. Гэта работа дала свае вынікі. Калі ў лютым прамфінплян цэху быў выкананы толькі на 90 проц., дык за першыя 20 дзён сакавіка гэта лічба ўзрасла да 124,6 проц. Моцная змена біркы пікаматар'яльнай за апошні месяц перавыканала сваё вытворчае заданьне на 30 проц.

Рад высокіх камсамольскіх ячэек Бабруйшчыны адзначылі правядзеньне кампаніі па абмене білетаў павышэньнем тэмпаў падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. У саўгасе Жыўчы па ініцыятыве камсамольскай ячэйкі арганізаваны двухмёсячныя курсы брыгадзіраў і рахункаводаў з ахопам 32 чал. Камсамольцы ячэйкі калгасу «Сьвет» за час падрыхтоўкі да абмену білетаў дабіліся стопроцантнай ссыпкі насенных фондаў, арганізацыі пасталянных вытворчых брыгад і замацаваньня да іх поўных зямельных вучасткаў. Зараз ячэйка вылучыла буксірную камсамольскую брыгаду на дапамогу калгасу «Чырвоны пуцілавец».

Зусім іншыя вынікі правядзеньня абмену камсамольскіх білетаў у тых калектывах, дзе партыйныя арганізацыі недаацанілі палітычнай важнасьці кампаніі. Сакратар парт'ячэйкі фабрыкі «Чырвоны харчавік» адмовіўся ставіць пытаньне аб абмене камсамольскіх білетаў на пасяджэньні бюро. Такія-ж адносіны да гэтай кампаніі мелі месца на заводзе «Калінтэрн», на фабрыцы імя Халтурына і інш. У рэзультаце недаацэнкі работы па абмене білетаў з боку партыйных ячэек на гэтых прадпрыемствах у абмене дапушчаны грубыя скажэньні і памылкі, якія неабходна зараз-жа выправіць.

Э. С.

Пробны рэйс рэчных суднаў БССР

НЕАДКЛАДНА ЗЬНІШЧЫЦЬ ВЫЯЎЛЕНЫЯ НЕДАХОПЫ!

Воднікі БССР, уступайце ў спаборніцтва на лепшае правядзеньне навігацыі!

Што паказаў пробны рэйс

Праведзены па ініцыятыве газэты «Зьвязда» пробны рэйс паказаў, што флёт БССР у асноўным гатоў да навігацыі. Аднак, ён адначасова выявіў і рад дэфэктаў, якія тлумачацца дрэннай якасьцю рамонту. Задача заключаецца ў тым, каб на-ходу выправіць недахопы рамонту, папярэдзіўшы паўторнасьць у часе навігацыі.

Нельга не паказаць на бліскучы ўзор магілеўскіх воднікаў, якія высунулі сустрэчны прамфінплян на перавозку грузаў і пасажыраў. Іх прыкладу павінны пасьледаваць усе воднікі БССР. Істотным недахопам зьяўляецца тое, што на большасьці суднаў трансфінплян яшчэ не прапрацаваны. Да гэтага трэба прыступіць неадкладна і разгарнуць распрацоўку сустрэчных планаў.

Як высьветлілася ў часе праверкі, рад кліентаў яшчэ і да гэтага часу ігнаруе дырэктывы партыі і ўраду аб скарыстаньні воднага транспарту. Упасобных мясцох вінавата ў гэтым кіраўніцтва рачнога транспарту. Яшчэ на значную колькасьць грузаў не заключаны ўмовы, слаба падвозяцца грузы да прыстаняй, у радзе месц не арганізаваны пагрузчча-разгрузачныя работы. Аб гэтым досыць канкрэтна паказана ў радзе карэспандэнцый. Такое становішча можа затармазіць работу па перавозках. Час ужо з гэтым пакончыць. Трэба па-бальшавіцку ўдарыць па апартуністычным супраціўленьні ў выкананьні дырэктыў партыі і ўраду аб загрузцы воднага транспарту. Флёт павінен мець поўную нагрузку.

Воднікі БССР, уступайце ў сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне навігацыі!

Поўнасьцю забясьпечыць судны грузамі

ГОМЕЛЬ, 9. (Па тэлефону).

Для праверкі гатоўнасьці Гомельскага флёту на прыстань зьявілася камісія ў складзе сакратара гаркому КП(б)Б тав. **Хлеўнікава**, яго намесьніка т. **Рубіна**, партарганізатара Дняпра-Дзьвінскага кіраўніцтва тав. **Шпака**, упаўнаважанага **Шаўчэнка**, прадстаўніка райкамводу, рэдакцыі газэты «Зьвязда», «Палескай праўды» і «Бел. фарвартэр».

Тав. Хлеўнікаў разам з усёй камісіяй дэтальна агледзіў усе параходы і попаравы флёт.

У 3 гадз. 30 хв. дня буксірны параход «Акадэмік забалотны» сіроцкай паведаміў аб сваёй гатоўнасьці да навігацыі. Яму адпукнуліся параходы «Чырвоная зьвязда», «Молатаў», «Сьлёсар», «Пралетары» і інш. Усяго у пробным рэйсе прымала ўдзел 7 параходаў з 10-ці. Тры параходы яшчэ поўнасьцю да навігацыі не падрыхтаваны — адзін знаходзіцца ў Кіеве ў капітальным рамонце, а ў двух выпрабоўваюць пуск катлоў. Пакуль рака Сож ачысьціцца ад ільду, будуць скончаны ўсе малярныя работы, якія зараз праводзяцца паскораным тэмпам.

У часе пробнага рэйсу на параходзе «Сьлёсар» яшчэ ня былі прымацаваны да калёс лапаткі. На параходзе «Чырвоная зьвязда» параходная палуба не пакрыта рэвентукам, лапаткі да калёс не прымацаваны, малярныя работы яшчэ ня скончаны. На пасажырскім параходзе «Молатаў» таксама малярныя работы ня скончаны. Найлепш падрыхтаваўся буксірны параход «Акадэмік забалотны».

Трэба адзначыць, што дыспэтчар не правёў патрэбнай работы да адкрыцьця навігацыі. Графік руху параходаў не даведзен да камандзіраў і каманд.

Слабым месцам зьяўляюцца пагрузачна-разгрузачныя работы. Мэханічнае абсталяваньне не ўстаноўлена. Згодна пастанову і дырэктыў ураду, пагрузачна-разгрузачныя работы павінна праводзіць кліентура, але да гэтага часу ёю нічога ня зроблена. У Прапойску не загружаюць тры баржы лесу. У Лоеве кліентура зусім не дала залаўкі, тлумачаны тым, што быццамбы няма грузаў.

Воднікі забясьпечаны прадуктамі на 3 месяцы.

Дрэнна з падвозкай грузаў да прыстаняй. У наяўнасьці ёсьць грузы на 5-6 дзён. Трэба прымусіць кліентуру поўнасьцю нагрузіць Гомельскі рачны транспарт грузам і зараз-жа наладзіць пагрузачна-разгрузачныя работы.

Гафт.

Магілеўскія воднікі высунулі сустрэчны

МАГІЛЕЎ, 12.

Пасьля ўзаемнай праверкі брыгадамі матросаў гатоўнасьці кожнага судна да навігацыі, быў зроблен пробны выезд флёту па рацэ.

На параходзе «Правда» ў часе выезду лопнула дымагарная труба. Параход гэты рамантаваўся на заводзе «Адраджэньне» і памянёная здарэньне тлумачыцца выключна-дрэннай якасьцю рамонту. Ударнікі-матросы на ходу выправілі гэты дэфэкт.

У гэты дзень воднікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі па выкананьні прамфінпляну і высунулі свой сустрэчны: **на 10 проц. павысіць плян па перавозцы і пагрузцы грузаў, на 8 проц. па перавозцы пасажыраў, на 5 проц. па эканоміі апалу.**

Кожная плавальная адзінка пераведзена на гаспадарчы разрахунак. Гэта дало магчымасьць рацыяналізаваць работу і вызваліць частку рабочай сілы.

Калі з забесьпячэньнем першых рэйсаў грузамі **малай хуткасьці** справа стаіць добра, дык значна горш з грузамі **вялікай хуткасьці.** З пляновых 32.720 тон заключана дагавораў па зусім нязначную колькасьць.

Такія кліенты, як шоўкавая фабрыка, гарбарня «Сталіна», маслазавод, сампрамсаюз, цэнтрасьпірт, Белуціль, хэмзавод, цагельні № 1, 2 і 3, Белмэталям, зусім не заключылі дагавораў на перавозку грузаў водным транспартам.

Трэба адзначыць, што аддзяленьне дырэкцыі Саюзтрансу яшчэ 1 студзеня перадала ў РБК-РСІ сьпіс кліентуры, якія не заключылі дагавораў, але дагэтуль мер ніякіх ня прынята. 13 сакавіка, бюро РК КП(б)Б вынесла пастанову — прыцягнуць да адказнасьці тых, хто ігнаруе заключэньне дагавораў на пляновыя перавозкі. Але і гэта пастанова засталася толькі на паперы.

Асобныя кліенты, як Галоўлартрапс, газавы завод Чырвонага крыжу, заготпункт саюзскур, завод «Чырвоны адраджэнец», мэблявая, цукеркавая і рымарная фабрыкі заключылі дагавары на перавозкі, але не паказалі куды, адкуль і калі будуць ісьці грузы.

У вельмі дрэнным стане знаходзіцца пад'язныя шляхі да пакгаўзаў прыстаней. Гарсавет ня прыняў ніякіх мер да рамонту іх.

Брыгада друку:

Прахарэнка, Мэндэльсон, Алан, Штурманскі, Чапега, Каліноўскі, Людагоўскі, Паршыкаў, Ларчанка, Даманчук, Траман, Карпенка, Курчык, Кальлега, Кастылёў, Сініла і Казерозец.

Да навігацыі гатовы!

Рэдакцыі газ. „Зьвязда"

ВІЦЕБСК. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). Пробны рэйс пасажырскіх буксірных адзінак і праверка рамонту паказалі балявую гатоўнасьць флёту да навігацыі. Штат паравога флёту ўкамплектован. Прамфінплян даведзен да суднаў, да камандаў. Грузы да першага рэйсу падвезены з перавышэньнем нормы. Разгортваем работу па забесьпячэньні перавыкананьня трансфінпляну.

Начальнік віцебскага раёну рачнога транспарту — **БАСКІН.**

Сакратар партарганізатар раёну — **СЕРАБРАКОЎ.**

МК воднікаў — **МАРКОВІЧ.**

Начальнік майстэрні — **КАЗЛОЎСКІ.**

Падвозка ідзе дрэнна

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

У часе пробнага выезду флёту выявілася, што ў машыннай частцы параходу імя Варашылава адсутнічаў манометр і вакомэтр. Менская праверачная палата ў працягу доўгага часу затрымлівае гэтыя прылады.

Усе параходы забясьпечаны рабочай сілай поўнасьцю. Дзякуючы ажыцьцяўленьню 6 умоў тав. Сталіна, камада параходу імя «КП(б)Б» **зьнізіла сабекошт рамонту ў параўнаньні з мінулым годам на 30 проц.** Каманды параходаў «КП(б)Б» і «Чырвоны араты» абавязаліся расходаваць апал замест 110 кгр. у гадзіну — 86 кгр.

Непаравы флёт таксама поўнасьцю гатоў да навігацыі. Усе баржы адрамантаваны. Штат укамплектован. Баржы забясьпечаны неабходнымі прыладамі і матар'ялам.

Значна горш з падвозкай грузаў да прыстані. Падвезенай колькасьці грузу хопіць толькі на першы рэйс. Сампрамсаюз, райсаюз, Белсаюз, ПРК, шклотрэст дагэтуль не заключылі дагавораў на перавозку грузаў, хаця адміністрацыя прыстані ня раз ставіла перад імі гэта пытаньне. Відаць, без умяшаньня пракуратуры ня прымусіш гэту кліентуру выкопваць дырэктывы партыі і ўраду.

Праведзена работа па наладжаньні бытавога абслугоўваньня камад паравога і непаравога флёту. На ўсіх параходах адрамантаваны пліты, абсталяваны буфэты.

Боднай каапэрацыяй загатоўлена гародніны на 4 месяцы, мяса і тлушчу — на 2 месяцы. Выписаны таксама газэты, часопісы і кнігі.

Каманды параходаў «КП(б)Б» «Чырвоны араты» і «Савецкая Беларусь» пераведзены на гаспадарчы разрахунак. У бліжэйшы час павінны быць пераведзены і астатнія параходы і баржы.

С. З.

Абязьлічка ў пагрузачна-разгрузачных работах

РЭЧЫЦА, 12.

Пробны рэйс паказаў гатоўнасьць усіх адзінак флёту да навігацыі. Добраякаснага вугалю хопіць на два месяцы. Каманды падабраны на 100 проц. Людзі расстаўлены па сваіх мясцох. Значнай перашкодай зьяўляецца тое, што з Гомелю ня высланы калгаснікі, хаця некалькі раз туды даваліся з гэтай прычыны тэлеграмы.

Трансфінплян, хаця і даведзен да кожнага параходу, але на агульных сходах каманд не прапрацован.

Трэба сказаць, што пагрузачна-разгрузачныя работы да гэтага часу абязьлічаны. Кліентура адмаўляецца ад арганізацыі іх. Штат грузчыкаў не ўкамплектован. Ёсьць сур'ёзная пагроза, што дрэнная арганізацыя пагрузачна-разгрузачных работ зьвіцца перашкодай у выкананьні пляну перавозак.

БАРСУКОЎ.

Трансфінплян не даведзен да суднаў

Паводле вызначанага пляну флёт Барысаўскай прыстані павінен у бягучым годзе папоўніцца яшчэ 2 паравымі адзінкамі з агульнай грузаладёмнасьцю ў 60 індыкатарных сіл. Павялічэньне тэнажу флёту выклікаецца ростам грузаперавозак. Аднак, кіраўніцтва Дняпра-Дзьвінскага рачнога транспарту да гэтага часу пават не паведаміла ў якім становішчы знаходзіцца справа перадачы дадатковага ліку паравых адзінак. Між тым, ужо зараз заяўкі кліентуры на перавозкі перавышаюць фактычныя магчымасьці пляўнага флёту. Агульны тэнаж флёту —81 тыс. тон, а ўжо зараз дагавары заключаны на 85 тыс. тон.

Праверка паказала, што да апошніх дзён трансфінплян не даведзен ня толькі да рабочых, але і да суднаў.

Н.

БССР заваявала пераходны чырвоны сьцяг Наркамфіну СССР

Прэзыдыум ЦК прафсаюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў і калегія Наркамфіну СССР у спэцыяльнай пастанове адзначылі, што ў чацьвертым квартале мінулага году Беларуская ССР паказала дасканалыя ўзоры работы на фінансавым фронце. Яна выканала плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва на 100,8 проц. і плян пляцяжоў у бюджэт аграмаджанай гаспадаркі на 116,4 проц.

Посьпехі чацьвертага кварталу БССР, шляхам далейшага разгортваньня масавай работы і ўзмацненьня бальшавіцкіх тэмпаў барацьбы за сацыялістычныя накапленьні змагла ў поўнай меры замацаваць у першым квартале 1932 г. Плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу БССР выканала на 103,2 проц. Кантрольнае заданьне па пляцяжох аграмаджанага сэктару рэалізавана на 105,6 проц.

Адзначаючы бальшавіцкія ўзоры работы, паказаныя арганізацыямі прафсаюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў і фінорганамі Савецкай Беларусі, прэзыдыум ЦК фінансава-банкаўскіх работнікаў і калегія Наркамфіну СССР пастанавілі: узнагарадзіць пераходным чырвоным сьцягам цэнтральнае праўленьне прафсаюзу фінбанкаўскіх работнікаў і калегію Наркамфіну БССР.

Джэлюк, Краўчук, Мяжэвіч, Такарчук, Паваротны

БАЛЬШАВІЦКАЯ САМАКРЫТЫКА—АСНОВА ПЕРАБУДОВЫ РАБОТЫ БелАПП

ПРАЛЕТАРСКАЯ ЛІТАРАТУРА — зброя клясавай барацьбы, магутны ваўтар камуністычнага выхаваньня мас і пераўтварэньня іх у актыўных і сьвядомых будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. На даным гістарычным этапе нашага разьвіцьця, калі пабудова бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва становіцца відзімай рэальнасьцю, роля літаратуры асабліва вялікая.

У нас літаратура зьяўляецца «частачкай агульна - пралетарскай справы». Пралетарыят Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, з посьпехам стварае вялікае бальшавіцкае мастацтва. Наша літаратура зьяўляецца найбольш ідэйна - пасычанай літаратурай за ўсім сьвеце, якой ня ведае гісторыя. Ленінская нацыянальная палітыка нашай партыі забясьпечыла гіганцкі рост нацыянальных культур, сацыялістычных па сваім зьместе. БелАПП, выражае ў масавую літаратуру - выхаваўчую арганізацыю, зьяўляецца **вядучым атрадам** усёй савецкай літаратуры БССР. Беларуская пралетарская літаратура і пралетарскія літаратуры нацыянальных меншасьцей з посьпехам змагаюцца за творчую **гегемонію** на літаратурным фронце.

У сваёй рабоце і разьвіцьці пралетарская літаратура БССР мела і мае багаты вопыт і дапамогу з боку пралетарскага літаратурнага руху РСФСР, вопыт і дапамогу пралетарскіх літаратур брацкіх нацыянальных рэспублік Савецкага Саюзу.

Такія творы, як **«Цені на сонцы»** і «Напор» Андрэя Алексіевіча, **«Гута»** — работага - качагара Р. Кобеца, **«Сполох на загонах»** — Кастуся Гаміавача, лепшыя творы Міхася Лынькова і іншых пралетарскіх пісьменьнікаў, ня гледзячы на іх пасобныя памылкі, уваходзяць у жалезны фонд пралетарскай літаратуры.

Па той-жа бок мяжы, у апушчанай Заходняй Беларусі, якая сьцякае крывёю пад ботам польскага фашызму, рэвалюцыйная літаратура загнана ў глыбокае падпольле. Апушчаны праводзяць палітыку самага дзікага і цынічнага сацыяльнага і нацыянальнага ўціску, насаджаючы праз карныя экспэдыцыя прымусовую палёнізацыю.

Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў мае вялікі вопыт клясавай барацьбы. Яна правяла значнае змаганьне супроць буржуазна рэакцыйных тэорый, шкодніцкай практыкі клясавага ворага, супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, беларускага нацыянал - дэмакратызму і шавінізму усіх масьцей і адценьняў. **Посьпехі, дасягнутыя пралетарскай літаратурай БССР пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, заваяваны ва ўпартай і непрымірымай барацьбе за ленінскую нацыянальную палітыку, супроць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай забясьпекі, і беларускага нацыяналізму.** Пралетарскі літаратурны рух Савецкай Беларусі расьце і загартоўваецца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы.

Наша крэпка на крутым уздыме культурнай рэвалюцыі. Аднак, пралетарская літаратура яшчэ значна адстае ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Яна далёка не здавальняе тых законных запатрабаваньняў, якія прад'яўляюцца ёй узрослымі і ўзрастаючымі запросамі рабочай клясы.

Сацыялізм усьпімае на гіганцкую вышыню культурны ўзровень пралетарыяту і працоўных мас вялікай савецкай краіны. «Сёньняшні рабочы, наш савецкі рабочы, хоча жыць з пакрыцьцём усіх сваіх матар'яльных і культурных патрэб... Ён мае на гэта права і мы павінны забясьпечыць яму гэтыя ўмовы» (І. Сталін). Глыбокім выразам узрослых запатрабаваньняў рабочай клясы да пралетарскай літаратуры зьявілася дыскусія паміж шматмільённым камсамолам і РАПП.

Шэсьць сістарычных умоў тав. Сталіна, пастановы XVII усесаюзнай партканферэнцыі й XIV зьезду КП(б)Б патрабуюць рашучай перабудовы нашай работы. Гэта асабліва датычыць літаратурнага фронту. Зусім правільна «Правда» завастрыла ўвагу на тым, што «кожны дзень зацяжкі перабудовы РАПП — тормаз у далейшым росьце пралетарскай літаратуры». **Ні на адзін дзень ня можа адцягвацца вытворчая перабудова Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў. Гэтага патрабуюць задачы будаўніцтва сацыялізму.**

БелАПП канкрэтна прыступіў у некаторай ступені да перабудовы сваёй работы. Творчыя пытаньні пачынаюць займаць цэнтральнае месца. Большасьць пралетарскіх пісьменьнікаў працуюць пад вялікімі актуальнымі тэмамі з практыкі сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэтыя якасныя зрухі вытворчай перабудовы БелАПП сьцьвярджаюцца ростам радоў пралетарскіх пісьменьнікаў, работай па закліку ўдарнікаў у літаратуру, разгортваньнем творчай дыскусіі й г. д.

Ёсьць усе ўмовы для таго, каб вытворчая перабудова работы пралетарскага літаратурнага руху праводзілася значна хутчэй. На сёньняшні-ж дзень БелАПП перабудоўваецца яшчэ **яўна нездавальняючымі тэмпамі.**

Пралетарская і саюзыніцкая літаратура павінны праводзіць вытворчую перабудову сваёй работы, выходзячы з задач поўнага і пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі аб стварэньні магнітабудаўнічага мастацтва.

Якія-ж прычыны тармозяць перабудову БелАПП? **Асноўнай прычынай зьяўляецца слабае разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі.**

Разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі ў БелАПП — самая неабходная і першачарговая ўмова перабудовы яе работы. Без пасьлядоўнай самакрытыкі ня можа быць далейшага руху наперад.

Такой сапраўднай самакрытыкі, самакрытыкі неабязьлічанай, не зважаючы на асобы, у БелАПП мы яшчэ маем вельмі мала. Самакрытыка ў БелАПП яшчэ ня стала асноўным мэтадам работы.

У нашых літаратурных арганізацыях часам прыходзіцца сустракаць барскія адносіны да бальшавіцкай крытыкі, сьціраньне вострых кутоў, элементы групаўшчыны (усямернае ўсхваленьне таварышоў са сваёй творчай групоўкі, творчасьці сваіх блізкіх сяброў і інш.). Асобныя беларускія таварышы лічаць, што толькі ім дано права крытыкаваць творчасьць, што толькі ім дазволена займацца крытычнай літаратурнай работай.

Усё гэта вяло да змазваньня тых сур'ёзных памылак, якія дапушчаны радам беларускіх крытыкаў. Неабходна таму шырока разгарнуць у БелАПП крытыку крытыкі, выкрыць усе зрывы, якія ёсьць на гэтым адказным вучастку.

Узяць, напрыклад, хоць-бы артыкул тав. Бэндэ «Матар'ялы да нарысаў па гісторыі беларускай літаратуры» («Маладняк» № 5, 1931 г.). Для таго, каб гістарычна прааналізаваць разьвіцьцё поўных літаратурных фактараў, неабходна раней за ўсё правільна зразумець і ацаніць суадносіны клясаў у даны канкрэтны пэрыяд, характар клясавай барацьбы. Як-жа тут у т. Бэндэ стаіць справа? У сваіх «Матар'ялах», адзначаючы клясавыя суадносіны ў рэвалюцыі 1905 году, тав. Бэндэ піша:

«Цэнтральным пытаньнем рэвалюцыі 1905 году зьяўлялася зямля, што рабіла рэвалюцыю сялянскай, буржуазнай, як і ўсякую сялянскую рэвалюцыю».

Тут — простая рэвізія ленінізму. Пытаньне аб зямлі адыгрывала вялікую ролю ў першай рускай рэвалюцыі, але-ж яно не зьяўлялася цэнтральным пытаньнем. Ленінізм вучыць, што «галоўным пытаньнем усякай рэвалюцыі зьяўляецца пытаньне аб дзяржаўнай уладзе. У руках якой клясы ўлада,—гэта вырашае ўсё. (І. Сталін, «Пытаньні ленінізму»).

Тав. Бэндэ ігнаруе ленінскі тэзіс аб перарастаньні буржуазна - дэмакратычнай рэвалюцыі ў рэвалюцыю сацыялістычную. Яго акрэсьленьне суадносін клясаў у рэвалюцыі 1905 году зьяўляецца трубапамыловым. Па аўтару атрымліваецца, што асноўнай рухаючай сілай рэвалюцыі **было сялянства, а рабочая кляса** толькі... **«дапамагала яму», «надавала рэвалюцыі дэмакратычны, народны характар».** Зусім відавочна, што гэтыя ўстаноўкі тав. Бэндэ проста процілеглы ленінізму. Яны самым грубым чынам скажаюць пытаньне аб ролі **рабочай клясы,** як **ГЕГЕМОНА і КІРАЎНІКА сялянства ў рэвалюцыі.**

Таксама наскрозь памылковае і наступнае цьверджаньне тав. Бэндэ, якое ярка паказвае наколькі далёк аўтар у гэтым артыкуле ад партыйнай, ленінскай ацэнкі карэнных пытаньняў рэвалюцыі 1905 году.

«Раскаты грому рэвалюцыі, — піша аўтар, — абудзілі ўсе (?) пласты, усе клясы тагачаснага грамадзтва». На рэвалюцыю ішлі з рознымі патрабаваньнямі і з рознымі мэтамі амаль усе клясы тагачаснага грамадзтва. На рэвалюцыю ішла (праўда з агляднай) да пары, да часу й буржуазія... **Яна ішла супроць самаўладзтва (?!!),** каб замяніўшы яго сабою, капіталісты, **памешчыкі** і вясковыя кулакі маглі спакойна і непадзельна рабаваць гарадзкіх рабочых, вясковую беднату і батракоў».

Выходзіць, як бачыце, што нават **памешчыкі,** не гаворачы ўжо пра буржуазію, гэта **асноўная апора расійскага самаўладзтва,** паводле аўтара зьяўлялася... актыўнай сілай у рэвалюцыі. Мала таго. У тым-жа артыкуле тав. Бэндэ піша, што «... буржуазная і дробна-буржуазная дэмакратыя ў пэўны час ва ўмовах царызму **мела права выступаць ад імя ўсяго беларускага народу** паколькі яна адлюстроўвала дэмакратычныя патрабаваньні...».

Партыя, на чале з Леніным, да канца выкрыла контр-рэвалюцыйную, здрадніцкую ролю буржуазнай і дробна-буржуазнай дэмакратыі 1905 году. Тав. Бэндэ другога погляду. Ён, як бачыце, заднім днём прадстаўляе права буржуазным і дробна-буржуазным дэмакратам «выступаць ад імя ўсяго народу».

Гэтыя палітычныя памылкі тав. Бэндэ **ЦАЛКАМ ПАЎТАРАЕ ў сваіх асноўных крытычных работах** (артыкул пра творчасьць Купалы («Шлях паэты»), апублікаваны адначасова ў «Маладняку» і «Полымі» і «Уступ» да хрэстаматыі «Беларуская літаратура», БДВ, 1931 год). Яны пашыраны таксама ў падручніках па літаратуры для нашых школ. Справа, аднак, гэтым ня вычэрпваецца. У пытаньнях літаратурнай тэорыі тав. Бэндэ дапускае таксама сур'ёзныя і грубыя памылкі. Ён пакрытычна падыходзіць да літаратурнай спадчыны Пляханава і поўнасьцю салідарызуецца з радам мэханістычных, меншавіцкіх установак В. Фрычэ па пытаньнях літаратуры і мастацтва, пры чым гэтыя ўстаноўкі кваліфікуюцца тав. Бэндэ як... «генэзіс мастацтва».

У сваіх «Матар'ялах», напрыклад, тав. Бэндэ прыводзіць наступнае антымарксыцкае сьцьвярджэньне Фрычэ:

«... первейшее назначение всякой надстройки в классовом обществе заключается в том, что она служит для классов средством, вывляя себя с той или другой стороны, утверждать свое бытие и свое господство в общественной жизни... По «надстройкам» класс может, конеч

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПА ЯКАСЬЦІ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Брак не выпускаць, бракам не гандляваць!

ГОЛАС ДЭЛЕГАТА-ЎДАРНІКА

Выступаўшыя ў спрэчках па дакладах Белшвэйаб'яднання, Белскураб'яднання і Белкаўчсаюзу дэлегаты па асобных швэйных і абутковых фабрыках далі выразны малюнак становішча з якасцю прадукцыі па прадпрыемствах БССР.

—На бабруйскай **швэйнай фабрыцы імя Дзяржынскага** да апошняга часу не прадугледжвалася лёгкай работы па паляпшэнню якасьці. Замест мабілізацыі рабочых мас на барацьбу з бракам, кіраўніцтва фабрыкі займалася апікунствам. Так, у лютым старшыня фабкому па бюро партканлекцыі тыну заявіў: «Якасьць нашай прадукцыі вельмі добрая». А калі прыехала камісія і праверыла склады, дык выявілася, што ўся прадукцыя, прызначаная для адпраўкі, зьяўляецца сапраўдным браком. Толькі пасьля змены кіраўніцтва на фабрыцы пагляднецца некаторы зрух. Арганізавана грамадзкі кантроль за якасьцю (добраахвотная грамадзкая інспэкцыя), праводзяцца рэйды ўдарнікаў друку. Але правядзенная работа далёка невы старчальная і якасьць прадукцыі ўсё яшчэ вельмі нізкая (тав. **Каўбасынкаў**).

— Паляпшэньню якасьці прадукцыі **віцебскай абутковай фабрыкі** перашкаджае неклапатнасьць у ліку кожнай аперацыі. У выніку шмат браку абязьлічана. Белскураб'яднанне павінна дапамагчы фабрыкам у барацьбе за якасьць. Треба папулярызаваць вопыт лепшых абутковых фабрык (тав. **Угарэц**).

На фабрыцы «Камінтэрн» (Гомель) у бручным цэху кала 6 тысяч пар чытаноў валяецца па працягу 4-х дзён на падлозе, топчацца нагамі і ніхто па гэта не зварачае ўвагі. На **фабрыцы імя Дзяржынскага** былі выпадкі, калі гарнітуры з вялікімі дэфэктамі пакаваліся ў скрынкі для адпраўкі. На тэй-жа фабрыцы загадчыкі цэхаў таямніца ад прыёмшчыка ставілі свае штэмпелі і прапускалі забракаваную прадукцыю (тав. **Данімаў** — НК лёгкай прамысловасьці БССР).

Тав. **Каган** з бабруйскага ЦРК дэманстраваў на канфэрэнцыі экспанаты браку — са 100 пар балетак, атрыманых з бабруйскага прамсаюзу, 75 пар аказаліся бракаванымі. Гомельская абутковая фабрыка прыслала бацінкі на адну нагу. Зусім непрыгодныя валёнкі вырабу менскай лямцавай фабрыкі.

Тав. **Гімэльсон** (віцебская гарбарня) ў сваім выступленьні адзначыў вялікую работу, праведзеную штодзённай штампавальнага цэху. Праведзены штодзённай мітынг прадукцыі даў бліскучыя вынікі.

—Белшвэйаб'яднанне мала дапамогі аказвае прадпрыемствам у перабудове работы на новаму. Значная колькасьць браку зьяўляецца вынікам таго, што мы аддаем малую ўвагу паляпшэнню кваліфікацыі новых кадраў рабочых. На прадпрыемствах Віцебску ёсьць шмат кантралёраў, якія незнаёмы з вытворчымі працэсамі і зразумела, ня могуць правільна праводзіць дракераж. Белшвэйаб'яднанне павінна арганізаваць кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы кантралёраў (тав. **Совэль** — віцебская швэйная фабрыка «Прафінтэрн»).

У спрэчках выступілі працаўнікі каапэрацыйных арганізацый і рабочых спажыўноў Іванава - Вазьнясенска, Смаленскай і Маскоўскай абласьцей.

Дэлегат Іванава - Вазьнясенскай вобласьці тав. **Саланцоў** у сваім выступленьні адзначыў нездавальняючую якасьць швэйнай прадукцыі БССР.

Кала 60 проц. швэйных вырабаў Іванава - Вазьнясенская вобласьць атрымлівае з БССР. Дрэнная якасьць прадукцыі б'е па матар'яльна-бытавых запатрабаваньнях рабочых мас. Каапэрацыйныя арганізацыі вобласьці абвясьцілі зараз вайну браку. Раду беларускіх прадпрыемстваў прад'явлены іскі. Так, «Шпрыклад», віцебская фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» павінна заплаціць штраф у 1.342 рублі.

Прамоўца прыводзіць цікавы факт. Калі Іванава - Вазьнясенская арганізацыі адмовіліся ад прыёмкі партыі бракаванай вопраткі вырабу фабрыкі «Прафінтэрн», дык апошняя ўжо больш за два месяцы ўпарта ігнаруе выкананьне шарадаў.

Іванава - Вазьнясенская вобласьць прад'яўляе швэйнай і абутковай прамысловасьці БССР сацыялістычны рамыўнік, які павінен зьявіцца магутным штурмам у забесьпячэньні паляпшэньня якасьці прадукцыі.

Прадстаўнік Заходняй вобласьці тав. **Вагноў** падкрэсьліў, што рабочыя спажыўцы незадаволены прадукцыяй, якая дасылаецца ім швэйнымі і абутковымі фабрыкамі Беларусі. Кала паўтара месяца назад атрымана 8 тысяч пар спэцабутку, які з-за нізкай якасьці нельга было выдаваць рабочым. Тав. Вагноў дэманструе на канфэрэнцыі прысланы піджак, дзе ёсьць гузікі, але няма петляў.

Дэлегат маскоўскіх каапэрацыйных арганізацый тав. **Вярхоўскі** азнаёміў канфэрэнцыю з вопытам барацьбы работнікаў прылаўкаў Масквы за якасьць прадукцыі. Магазын «Мосторга», напрыклад, пры ўпакоўцы тавараў у кожную скрынку ўкладваў картку-пытальнік да спажыўца. Кала 75 проц. картак былі атрыманы назад з водгукамі аб якасьці прадукцыі і канкрэтнымі прапановамі па зьнішчэньні браку. На аснове гэтых картак магазын прад'явіў сацыялістычны рахунак прадпрыемствам.

Выступаўшы з прамовай старшыня ЦК саюзу швэйнікаў СССР тав. **Ягорава** звярнула ўвагу ўдзельнікаў канфэрэнцыі на выкананьне прамфінпляна швэйнай прамысловасьцю. У 1932 г. рабочыя - швэйнікі павінны намагчы ўсе сілы, каб ліквідаваць заказычанасьць перад дзяржавай, створаную невыкананьнем прамфінпляну ў мінулым годзе. Канфэрэнцыя па якасьці, якая зараз адбываецца, гаворыць аб тым, што ў справу барацьбы за якасьць работы ўцягваюцца шырокія працоўныя масы. Гэта толькі пачатак далейшай упартай пастоянай работы па поўнай ліквідацыі браку, па паляпшэньні забесьпячэньня рабочых - спажыўцоў. Поўная рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна забясьпечвае далейшае паляпшэньне якасьці прадукцыі.

Старшыня ЦК саюзу гарбароў тав. **Брэгман** у сваёй прамове спыніўся на неабходнасьці шырокай папулярызацыі вопыту работы лепшых ударнікаў якасьці. Тав. Брэгман падкрэсьліў, што толькі **поўнае ажыцьцяўленьне і колькасных і якасных паказальнікаў можа сьведчыць аб добрай работе прадпрыемства.** Каб ліквідаваць брак, треба канчаткова зьнішчыць абязьлічку ў якасьці, будаваць сыстэму зарплаты ў залежнасьці ад выкананьня якасных паказальнікаў і больш рашуча праводзіць кантроль рублём.

Дзе карэньні дрэннай якасьці?

(З выступленьня старшыні ЦК саюзу работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю СССР тав. Мароза)

Тав. Мароз падкрэсьлівае, што ініцыятыва БССР у скліканьні дапай канфэрэнцыі заслугоўвае асаблівай увагі з боку ўсёй грамадзкасьці Савецкага Саюзу.

Вопыт Беларусі, — гаворыць ён, — треба неадкладна перанесьці ва ўсе рэспублікі СССР.

Спыняючыся на ўсім неадзальняючай якасьці прадукцыі швэйных фабрык, тав. Мароз указвае, што адной з прычын такога становішча зьяўляецца **мэнапольнасьць** іх ў швэйнай вытворчасьці Саюзу. З 700 млн. мэтраў бавоўняна-папяровай тканіны, 620 млн. мэтраў было перапрацавана дзяржаўнай швэйнай прамысловасьцю. Тав. Мароз робіць вывад, што неабходна паширыць сетку швэйных майстэрань, якія-б працавалі на заказ непасрэдна ад спажыўца. Кожная швэйная фабрыка павінна мець у сабе цэх, які-б прымаў заказы ад рабочага спажыўца. Белкаўчсаюз і Белшвэйаб'яднанне ў гэтых адносінах пакуль нічога не зрабілі. Не адкрыта ні адной майстэрні, якая-б працавала на заказ ад спажыўца.

Другой прычынай дрэннай якасьці швэйных вырабаў, — гаворыць тав. Мароз, — зьяўляецца **адсутнасьць арганізаваных заказаў** з боку тавараправодзячай сеткі. Да гэтага часу ў нас было такое становішча, што галоўна каапэрацыйныя арганізацыі прымалі ўсё, што ім давала швэйная прамысловасьць. Ад гэтага нам треба адмовіцца. Каапэрацыя павінна загадзя рабіць заказ швэйнай прамысловасьці, прымаючы пад увагу патрэбы спажыўца як ў адносінах колеру, так і фасону.

І, нарэшце, трэцяй прычынай неадзальняючай якасьці — гаворыць т. Мароз, — зьяўляюцца **нядбайныя адносіны** да работы з боку пасобных рабочых, майстраў і адміністрацыі, неадалые аўладаць тэхнікай справы — з аднаго боку, і дрэнны кантроль за якасьцю прадукцыі — з другога.

Неабходна ўзмацніць кантроль за якасьцю прадукцыі ня толькі непасрэдна на прадпрыемствах, але і з боку тавараправодзячай сеткі. Сыстэма штрафаў прадпрыемстваў, якія прапускаюць брак, павінна стаць адной з важнейшых форм барацьбы за якасьць. Адначасова треба шырока разгарнуць масавыя формы грамадзкага кантролю як на фабрыках, так і ў гандлёвай сетцы. Грамадзкія суды, выстаўкі бракаванай і добрай прадукцыі, грамадзкія заслоны, сацыялістычныя рахункі — вось тыя формы, ініцыятарамі і актыўнымі правадзікамі якіх павінны быць прафсаюзныя арганізацыі.

4 баявыя задачы

т(З прамовы рэдактара газэты „СКТ" т. Нодэля)

Рэзультаты падрыхтоўкі да дапай канфэрэнцыі, — кажа тав. **Нодэль**, — сьведчаць аб тым, што нам удалося ў значнай меры павярнуць увагу гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый да барацьбы за якасьць.

Але дасягнутыя посьпехі далёка невыстарчальны. Мы павінны яшчэ больш узмацніць барацьбу за якасьць.

Спыняючыся на практычных мерапрыемствах барацьбы з бракам, тав. **Нодэль** высунуў 4 асноўныя задачы.

Першая задача заключаецца ў тым, каб самі фабрыкі і заводы разгарнулі **шырокую масавую работу** сярод рабочых, мабілізавалі іх на барацьбу за якасьць прадукцыі. Треба ўзмацніць тэхнічны і грамадзкі кантроль за якасьцю, аўладаць тэхнікай вытворчасьці, узьняць кваліфікацыю рабочых.

Другая задача — **узмацніць кантроль за якасьцю прадукцыі з боку тавараправодзячай сеткі**, шырока разгарнуць сыстэму прад'явленьня сацыялістычных рахункаў прадпрыемствам, паширыць масавыя формы барацьбы з бракам (грамадзкія заслоны, выстаўкі бракаванай і добраякаснай прадукцыі, грамадзкія суды і г. д.). Кантраляваць прадпрыемствы рублём (сыстэма штрафаў).

Трэцяя задача — **правяраць нашы пастановы, праверацъ канолькі выконваюцца мерапрыемствы, якія мы намячаем.** Пры гэтым асабліва трэба зьвярнуць увагу на перапісьменьне добрага вопыту аднаго прадпрыемства на іншыя, рабіць гэты вопыт здабыткам шырокіх рабочых мас.

І, нарэшце, чацьвертая задача — разьвіцьцё шырокай сеткі майстэрань, разьлічаных на індывідуальны заказ спажыўца. Зразумела, гэта ні ў якай меры не азначае, што мы павінны хоць на хвіліну аслабіць увагу да разьвіцьця буйнай тэхнічна-абсталяванай прамысловасьці.

— Барацьба за якасьць, якую так шырока разгарнула БССР, павінна быць прыкладам для ўсіх рэспублік Саюзу. Задача ўсіх цэнтральных арганізацый, у тым ліку і газэты «С. К. Т.», зрабіць вопыт БССР здабыткам усёй краіны.

Прэміі—лепшым ударнікам якасьці

На заключным пасяджэньні канфэрэнцыі 11 красавіка адбылася раздача прэмій лепшым барацьбітам за якасьць прадукцыі.

Па ШВЭЙНАЙ прамысловасьці прэміі атрымалі: першая істужка першага арэгату фабрыкі «Кастрычнік» — 600 рублёў, брыгада АВЭРБУХА і КРЭУСКАГА тэй-жа фабрыкі—па 250 руб. кожная, закройны цэх фабрыкі імя Валадарскага — 500 руб., брыгада тав. ДВОРКІНА (фабрыка «Камінтэрн») — 250 руб., брыгады т. т. ПІНЧУКА і ЭЙДЛІНА тэй-жа фабрыкі — па 200 руб. кожная; цэх тав. ПУРЫНСОНА (фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі») — 500 руб., брыгада ДОЎНЭРА і РАСОЎСКАЙ (фабрыка імя Крупскай) — па 250 руб. кожная, чырвонасьцяжны арэгат фабзавучу КІМ (Менск) — 400 руб., цэх тав. ЗАГЕЛЬСКАГА (фабрыка «Прафінтэрн») — 500 руб., шматтыражка фабрыкі «Кастрычнік» — 500 руб., штодзённа зьмены тав. МАР'ЯСКІНА (фабрыка імя Валадарскага) — 200 руб.

Па САЮЗЕ РАБОТНІКАЎ КААПЭРАЦЫІ І ДЗЯРЖАЎНАГА ГАНДЛЮ прэміі атрымалі капектыў крамы № 1 гатовай вопраткі (Менск) — 300 руб., крама № 1 ЗВК (Менск) — 400 руб., крама № 1 абутковага аб'яднаньня Белкаўчсаюзу (Менск) — 300 руб., крама № 2 ЗРК мэталістаў (Менск) — 300 руб., крама № 2 гатовай вопраткі Белкаўчсаюзу (Менск) — 200 руб., прамтаварны склад Белгандлю (Менск) — 200 руб., магазын № 1 ЗВК (Віцебск) — 400 руб., крама № 3 ЗРК краўцоў — 300 руб. (Віцебск), прамтаварная база ЦРК (Віцебск) — 150 руб., мясцком Белгандлю (Віцебск) — 150 руб., рэдакцыя насьцянгазэты ЗВК (Гомель) — 200 руб., крама прамтавараў ЗРК «Пралетары» (Гомель) — 100 руб., ударнік крамы скураб'яднаньня тав. ФАРБЭРАЎ (Гомель) — 150 руб., МК ЗРК «Камінтэрн» (Гомель) — 300 руб., ударнікі ЗРК «Сельмаш» (Гомель) т. т. БЭРМАН і РУДЗІН — па 250 руб. кожны, прамтаварная база ЦРК (Гомель) — 200 руб., ударнік тав. ГІТЭЛЬМАН (Гомель, крама гатовай вопраткі) — пуцёўку на курорт; ударнік ЗРК бабруйскага дрэвапрацоўчага камбінату тав. КАЦКЭЛЬСОН — пуцёўку на курорт, ударнік складу ЦРК тав. ПЭЎЗНЭР (Бабруйск) — 150 руб., абутковая крама БКС (Бабруйск) — 150 руб., ударнік крамы № 10 тав. ЛЕВІТ (Магілеў) — 150 руб.

Выданы таксама прэміі раду ўдарнікаў АБУТКОВЫХ ФАБРЫК БССР.

МЕНСКУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ АСОАВІЯХІМУ

ПЕРАТВОРЫМ ВА ЗУОРНЫ ВУЧАСТАК АБАРОНЧАЙ РАБОТЫ

На вышэйшую ступень!

Карэспандэнцы, якія сёньня зьмяшчаюцца ў «Зьвязьдзе», гаворыць аб тым, што стан абарончай работы на большасьці прадпрыемстваў гор. Менску яшчэ не на належнай выпыні.

Адной з прычыны, якая тармозіць разгортваньне работы, зьяўляецца слабае кіраўніцтва многіх партыйных ячэек нізавымі зьвеньнямі Асоавіяхіму. Удзел камсамолу да апошняга часу яўна невыстарчальны. Некаторыя камсамольскія арганізацыі на ўвазваюць абарончай работы з кампаніяй абмену білетаў. Партыйныя, камсамольскія і прафэсыянальныя арганізацыі яшчэ не павярнуліся як след тварам да ажыцьцяўленьня лёзунгу: кожны завод—крэпасьць абароны. Адсюль процант ахопу рабочых арганізацыяй невыстарчальны. У некаторых арганізацыях (завод імя «Варашылава» і інш.) няма нават поўнага ліку членаў. Процант паведваньня заняткаў бывае часта нізкі. Работа па аўладаньні вайсковай тэхнікай толькі пачынаецца. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ва многіх ячэйках амаль што не разгорнута.

Вялікую долю віны нясе і гарсавет Асоавіяхіму, які не забясьпечыў у выстарчальнай меры кіраўніцтвам работу нізавых арганізацый.

За апошні час з боку некаторых партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый назіраецца пэўны пералом у гэтай рабоце. Треба гэты пералом замацаваць і разьвіць, павысіць кіраўніцтва і дапамогу ячэйкам АСО.

Неабходна перабудаваць работу на падставе пастаноў апошняга пленуму ЦС АСО—перанесьці цэнтр цяжару ўсёй работы ў нізавыя ячэйкі. Скарыстаць усе мэтады і формы агітацыйна-масавай работы для прапаганды тэхнікі і вайсковага навучаньня.

Апраўдаць ганаровую годнасьць

Адзін з буйнейшых машына - будаўнічых заводаў Савецкай Беларусі—былы завод «Энэргія»—носіць цяпер ганаровае імя Кліма Варашылава. Гэта шмат у чым абавязвае рабочых заводу. Ганаровая годнасьць абавязвае рабочых калектыў з энтузіязмам змагацца за баявое выкананьне прамфінпляну, за якасьць прадукцыі. Абарончая работа павінна быць пастаўлена на самую высокую ступень. Завод павінен стаць запраўдным крэпасьцю абароны. Толькі пры такіх умовах імя Кліма Варашылава завод можа насіць з гонарам.

У якім-жа становішчы знаходзіцца абарончая работа на справе? Адказ будзе далёка не ганаровым для варашылаўцаў. Пры паяўнасьці пэўных дадатных фактаў, вайсковая справа паоул не стаіць на належнай выпыні. Партарганізацыя належнай ўвагі гэтаму яшчэ не аддае. Тое самае можна сказаць і аб камсамоле, хоць з боку апошняга заўважаецца пэўны пералом.

Каб пацьвердзіць нездавальняючасьць вайсковай работы, даволі сказаць, што яшчэ няма нават поўнага ліку членаў Асоавіяхіму. Не разгорнута масавая работа закол пытаньняў абароны. Завочнікі друк таксама недзвычай мала аддаваў гэтаму ўвагі.

На заводзе праходзіць палрыхтоўка прыкмётнікоў. Праходзіць даволі здавальняюча. Гурток СПА працуе таксама ня дрэнна. Астатнія віды вайсковай падрыхтоўкі знаходзяцца ў нездавальняючым стане. Ёю ахоплена толькі да 10 проц. членаў асоавіяхімаўскай арганізацыі. Уся работа ня носіць плянавага характару, ня мае мэта імкнёнасьці, адзначаецца нізкай якасьцю.

Ахоплена вайсковай вучобай усяго кала 30 проц. камсамольцаў.

Кампанія мабілізацыі сродкаў на абарончую работу праходзіць самацёкам. Білеты 6-й усесаюзнай лётарэі Асоавіяхіму разьмяркоўваліся на цэхах бяз ўсякай агітацыйна-масавай работы, у выніку чаго яны амаль не распаўсюджаны.

Шэфства над Чырвонай арміяй таксама пастаўлена слаба. Не вядзецца сыстэматычнага супрацоўніцтва з падшэфнымі часьцямі, няма паміж заводжімі арганізацыямі і Чырвонай арміяй цеснай штодзённай сувязі.

Ф. і В. Т.

На шляху да пералому

На менскім машынабудаўнічым заводзе «Камунар» асоавіяхімаўская работа была пастаўлена слаба. Ня было нават поўнага ліку членаў Асоавіяхіму. Толькі ў апошні час партком заводу гэтай бязьдзейнасьці паклаў канец.

Мерапрыемствы, прынятыя партканлектывам, далі добрыя вынікі. У рабоце асоавіяхімаўскай арганізацыі зроблен вялікі зрух. Зараз працуе 6 гурткоў: стралковы—60 чалавек, два санітарныя гурткі—30 чалавек, дзе займаюцца работніцы, і два гурткі сувязі—44 чалавекі. Падрыхтоўкі 910 году абвясьцілі лёзунг аўладаць вайсковай тэхнікай і гэты лёзунг выконваюць. Усе яны займаюцца ў гуртку матарыстаў. Заняткі гурткоў праходзяць здавальняюча. Наведваньне ў сярэднім 86 проц.

У сувязі з абменам камсамольскіх білетаў, актыўны ўдзел у рабоце калектыву Асоавіяхіму прымае заводзкая камсамольская арганізацыя. Яна ўключылася ў паход на лепшага стралка і ўзяла на сябе самаабавязацельства падрыхтаваць 30 лепшых стралкоў. Ужо падрыхтаваны 12. Нягта ўліку членаў. Процант паведваньня заняткаў бывае часта нізкі. Работа па аўладаньні вайсковай тэхнікай толькі пачынаецца. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ва многіх ячэйках амаль што не разгорнута.

Вялікую долю віны нясе і гарсавет Асоавіяхіму, які не забясьпечыў у выстарчальнай меры кіраўніцтвам работу нізавых арганізацый.

За апошні час з боку некаторых партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый назіраецца пэўны пералом у гэтай рабоце. Треба гэты пералом замацаваць і разьвіць, павысіць кіраўніцтва і дапамогу ячэйкам АСО.

Неабходна перабудаваць работу на падставе пастаноў апошняга пленуму ЦС АСО—перанесьці цэнтр цяжару ўсёй работы ў нізавыя ячэйкі. Скарыстаць усе мэтады і формы агітацыйна-масавай работы для прапаганды тэхнікі і вайсковага навучаньня.

У глыбокім тыле

Партыйная і прафэсыянальная арганізацыі **менскай электрастанцыі** яшчэ стаяць у баку ад работы Асоавіяхіму. У выніку такой недапушчальнай вайсковая справа на заводзе зусім не разгорнута. З ліку 600 рабочых толькі 250 чалавек ахоплены членствам Асоавіяхіму.

Самым слабым месцам работы зьяўляецца вайскова - тэхнічная вучоба. У гэтай справе адсутнічае якая-б там ні была плянавасьць. Фармальна на сёньняшні дзень створаны гурткі пры 5 цэхах па вывучэньні стралковай справы, але работа іх праводзіцца вельмі слаба. Да навучаньня ў гурткох прыцягнута ня больш 150 чалавек рабочых. Па віне заўкому заняткі гурткоў сыстэматычна зрываюцца. Так, ня гледзячы на пастанову аб тым, што ў спэцыяльна вызначаны дні вайсковых заняткаў нізкіх іншых сходаў не павінна праводзіцца, заўком вызначае правядзеньне розных сходаў і нарад. У выніку шмат заняткаў сарвана.

Адзін з важнейшых сродкаў работы — масавая вайскова - тэхнічная прапаганда — знаходзіцца на вельмі нізкім узроўні. Дагэтуль ні адна з арганізацый заводу не паклапацілася аб тым, каб арганізаваць і належным чынам абсталяваць спэцыяльны гурток для правядзеньня вайсковай работы.

Ініцыятыва перадавых рабочых у напрамку разгортваньня новых форм і мэтадаў работы як след не скарыстоўваецца. Так, работніцы ў ліку 16 асоб пастанавілі арганізаваць вайскова-тэлефонна-тэлеграфны гурток. Але для разгортваньня парматыпай работы ёсьць шмат перашкод. Дагэтуль яшчэ не набыты самыя неабходныя прылады, як тэлеграфны апарат, адпаведная літаратура і плякаты. Зараз красавік абвешчан штурмавым месяцам па ўзмацненні вайсковай работы. Намечана за гэты адрэзак часу 100 проц. рабочых уцягнуць у члены Асоавіяхіму, а таксама ў гурткі па вывучэньні вайсковай справы. Месцкім павінен забясьпечыць кіраўніцтва паляпшэньне работы асоавіяхімаўскай арганізацыі электрастанцыі. **Я. К.**

Адкрыцьцё менскай гарадзкой канфэрэнцыі Асоавіяхіму

12 красавіка, а 19 гадзіне, у памяшканьні Белдзяржтэатру пачала работу 2-я менская гарадзкая канфэрэнцыя Асоавіяхіму.

Канфэрэнцыю адкрыў старшыня гарадзкога савету Асоавіяхіму тав. **Валодзька**, які ў сваёй прамове спыніўся на міжнародным становішчы, падрыхтоўцы буржуазіі да нападу на СССР і адзначыў неабходнасьць рашучага паляпшэньня абарончай работы на прадпрыемствах і ўстановах Менску.

Канфэрэнцыю віталі арганізацыі Асоавіяхіму заводу «Камунар» і «Кастрычнік», якія ў сваіх рапартах спыняючыся на дасягненьнях і недахопах, заклікалі канфэрэнцыю ў тым, што вайсковая работа будзе паладжана як след. Прадстаўнік асоавіяхімаўскай арганізацыі АБВШ запэўніе, што курсанты і начальніцкі склад школы прымуць усе захады для ўзьняцьця вайсковай работы ў падшэфных прадпрыемствах.

Пасьля гэтага са справаздачай аб рабоце ЦС Асоавіяхіму БССР выступіў тав. Дрылёнак.

насьцьвярджэньня В. Фрычэ, што кляса «бязумоўна можа» пазнаць свае клясавае «я» па-надбудовах, у тым ліку і па мастацтве. Дыялектыка тут такава, што пад выглядам барацьбы з пасыўным сузіраньнем абараняецца пасыўнасьць, самацёк, паўзучы эмпірызм. Пякрытычны падыход аўтара да работ Фрычэ прывёў яго да апалягетыкі, грубейшых мэханістычных «меншавіцкіх памылак, якія маюць месца ў гэтых работах.

Недыялектычнае, немарксыцкае тлумачэньне дае тав. Бэндэ таксама і клясавай барацьбе літаратур розных клясаў. У сваім «Уступе» да літаратурнай хрэстаматыі ён, напрыклад, пафрычынску ўстанаўляе нейкі абстрагаваны надклясавы стыль эпохі. У другім сваім артыкуле («Матар'ялы да нарысу па гісторыі беларускай літаратуры») аўтар выстаўляе такога роду канцэпцыю:

«Працэс літаратурнага разьвіцьця нельга разглядаць, як працэс сужыцьця розных клясавых літаратурных кірункаў. Гэты працэс, складаючы антаганістычнае адзінства літаратуры, ішоў і ідзе праз узаемную барацьбу клясавых літаратур (клясавых ідэалёгій), праз узаемны ўплыў аднаго кірунку на другі. **ПРАЗ ПАДПАРАДКАВАНЬНЕ АДНЭЙ ЛІТАРАТУРЫ ДРУГОЙ».**

Такім чынам, працэс літаратурнага разьвіцьця зводзіцца **да падпарадкаваньня літаратуры прыналежнай** клясы літаратуры пануючай клясы, чым тав. Бэндэ фактычна **зьнімае** пытаньне аб клясавай барацьбе ў літаратуры.

У артыкуле «Творчыя задачы пралетарскай літаратуры» («Маладняк» № 9, 1931 г.) мы знаходзім у тав. Бэндэ элементы скатваньня на пазыцыі пляханаўскага аб'ектызму. Аўтар аддае шмат месца для сьцьвярджэньняў аб тым, што «мастацтва і літаратура маюць сваім аб'ектам аб'ектыўную рэчаіснасьць». Але ён упускае галоўнае — тав. Бэндэ **не падкрэсьлівае неабходнасьці ПАРТЫЙНАГА падыходу да аб'ектыўнай рэчаіснасьці**, чым па сутнасьці і пераходзіць на пазыцыі меншавіцкага аб'ектывізму. Характэрна, што ў якасьці крытэрыя для пазнаньня сутнасьці мастацтва аўтар прыводзіць наступную наскрозь ідэалістычную цытату з філёзофскіх работ Гегеля:

«Яўленьне искусства не только суть простая видимость, но по сравнению с обыденной действительностью им следует приписать более высокую реальность и более истинное бытие...».

Праўда, тав. Бэндэ мімаходам адзначае сваю, так сказаць, нязгоду са словамі Гегеля пра «больш высокую роальнасьць і больш сапраўднае быцьцё», але тут-жа сьцьвярджае, што гэта гегелеўская цытата зьяўляецца... «**формулай**» пазнаньня спэцыфікі мастацтва. Агаворка, як бачыце, становішча ня выпраўляе.

Тав. Бэндэ правёў сур'ёзную работу па выкрыцьці тэорыі і практыкі беларускіх нацыянал-дэмакратаў на літаратурным фронце. Аднак, крытычныя работы тав. Бэндэ не пазбаўлены, на жаль, ідэалёгічных і мэтадалёгічных зрываў. Памылкі тав. Бэндэ трэба ўзяць пад разгорнутую крытыку, каб дапамагчы яму іх перамагчы.

Нельга прайсьці міма буйнейшых зрываў, дапушчаных у крытычных артыкулах тав. Кучара. Памылкі ў літаратурных выступленьнях крытыка Ал. Кучара маюць асабліва сур'ёзны і небясьпечны характар. Артыкулы і рэцэнзіі Ал. Кучара ў сваёй большасьці не дапамагаюць нашым літаратурным кадрам у аўладаньні марксыцка-ленінскім сьветапоглядам і ня спрыяюць іх росту. Для сваіх работ Ал. Кучар цалкам бярэ меншавіцкую мэтадалёгію Пляханава, выяўляючы тым самым поўную салідарнасьць з выкрытым і асуджаным партыяй лёзунгам:—«за пляханаўскую артадоксію». Рад артыкулаў Ал. Кучара знаходзіцца таксама пад вялікім уплывам пераверзеўшчыны.

Яўна меншавіцкія канцэпцыі можна знайсьці, напрыклад, у артыкуле Ал. Кучара пра аповесьць Кузьмы Чорнага «Лявон Бушмар» («Маладняк» № 1, 1931 г.). У гэтым артыкуле Кучар не аналізуе ідэй, якія выказвае пісьменьнік у сваім мастацкім творы. Ён не дае партыйнай клясавай ацэнкі ідэйнаму боку аповесьці. Кучар выходзіць з пераверзіянскага «закону» аб тым, што пісьменьнік дае нам «мастацкія вобразы і толькі вобразы». Кучар падрабязна разглядае кожную дробязь жыцьця кулака Лявона Бушмара — «цэнтральнага вобразу» аповесьці. У гэтым сваім разглядзе аўтар заяўляе, што «... **на працягу ўсёй аповесьці ВОБРАЗ Лявона Бушмара ВЫРАСТАЕ Ў ТАКІ МАГУТНЫ ВОБРАЗ, што САМ АЎТАР аказаўся ПАДПАРАДКАВАНЫМ ЯМУ, а ня ён аўтару».**

Тут т. Кучар кантрабандай працягвае ідэі вароншчыны аб пераваезе падсьвядомага, інтуіцыйнага ў творчым працэсе пісьменьніка. Выходзіць, як бачыце, што ня пісьменьнік вырашае свае клясавыя ідэі праз мастацкія вобразы, а гэтыя вобразы самі маюць у аповесьці «Лявон Бушмар» такую сілу, якая цалкам падпарадкоўвае сябе Кузьму Чорнага. Адсюль — рукой падаць да меншавіцкага «генэзісу» мастацкай літаратуры, які сфармуляван Пляханавым і які заключаецца ў тым, што «нельга мастаку ставіць у віну тыя погляды, якія выказваюць яго героі».

У сваіх мяшчанска-ідэалістычных «літаратурных партрэтах» Ал. Кучар так пісаў пра творчасьць В. Каваля:

«Трэці год жыве Васіль Каваль у горадзе і нічога ні ў яго «партрэце», ні ў паводзінах за гэты час не зьмянілася.

Праўда, у паводзінах за зьмену можна лічыць хіба тое, што ў горадзе ён стаў больш сарамлівым.

Здаецца, пусьці яго ў вёску, ён багата пасьмялее, ён знойдзе там людзей па сябе...».

Ня будзем камэнтаваць гэту апалёгетыку пераваньшчыны, дзе «суб'ект творчага працэсу» зьяўляецца... звышчалавекам, надклясавым зьявішчам, на якое ня можа быць уплыву сацыяльнага асяродзьдзя. Сам аўтар праз два гады пасьпешны (?) прызнаецца, што яго «партрэты» зьяўляюцца, так сказаць... няпоўнымі. Адзначым, што буржуазны характар гэтых самых «партрэтаў» Ал. Кучар абышоў маўчаньнем. У мэтах, як піша сам аўтар, «выправіць» свае ранейшыя памылкі, Кучар напісаў другі нарыс пра творчасьць В. Каваля, зьмешчаны ў часопісі «Маладняк» (№ 9, 1931 г.). Аднак, аўтар ня толькі не паправіў сваіх ранейшых памылак, але ў некаторай ступені іх паглыбіў. На гэтым нарысе ляжыць пячатка пераверзеўшчыны. Аўтара цікавіць у творах В. Кавала ня іх клясавыя ідэі, ня іх сацыяльная сутнасьць. Аўтар цалкам пагружаецца ў эстэтычны бок творчасьці пісьменьніка. Ён шукае пераверзіянскі «цэнтральны вобраз». У Ал. Кучара вобраз засланяе ідэю.

Возьмем артыкул Кучара «Сымон Баранавых» («Полымя» № 2, 1931 г.). У артыкуле даецца разгляд аповесьці гэтага пісьменьніка «Межы». Сымон Баранавых — значная фігура з маладой пляды беларускіх савецкіх пісьменьнікаў, з мастацкімі здольнасьцямі і робіць спробы станаўленьня ў саюзь пікі. Але ў сваіх аповесьцях «Чужая зямля» і «Межы» Сымон Баранавых аддае значную даніну кулацкай ідэалёгіі. Калектывізацыя ў вёсцы Брод, паводле аповесьці Сымона Баранавых «Межы», праходзіць без кіраўніцтва партыі, **самацёкам, стыхійна.** У аповесьці няма ўдзелу рабочых гораду ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, няма арганізуючай і кіруючай ролі партыі, абыйдзена клясавая дыферэнцыяцыя вёскі. Бядняк з калектывізацыі зусім выпаў. Арганізуюць калгас выключна «гаспадарныя сераднякі» — і масы запісваюцца ў калгас таму, што ініцыятарамі гэтай справы зьяўляюцца добрыя, заможныя гаспадары і калі што якое здарыцца, дык яны «могуць адказаць сваёй маемасьцю».

Задача марксыцкага крытыка — паказаць пісьменьніку па сур'ёзным ідэалёгічным памылкі ў яго творчасьці, дапамагчы яму перамагчы гэтыя памылкі. Ал. Кучар фактычна змазвае гэтыя памылкі, натурае ім. Кучар знаходзіць, што пісьменьнік «вядзе масы сялянства ў калгасы **сваім асаблівым шляхам»**, спакойна канстатуе гэта і не выкрывае правазапартупістычны характар гэтага «шляху».

Крытык ня ўскрывае буйных правых памылак у творчай практыцы Сымона Баранавых, а залічае аповесьць «Межы» амаль у пралетарскія творы, лічыць такой, якая «адлюстроўвае надзвычай актуальную і жыцьцёвую тэму сёньняшняга дня — калектывізацыю».

Парочнасьць мэтадалёгічных асноў Ал. Кучара з усёй аголенасьцю выяўляецца ў яго крытыцы апошніх буржуазных нарысаў Скрыгана «Гомсельмаш», якія ставяцца Кучарам па парог пралетарскай літаратуры.

Тав. Кучар, усьвядомёўшы і выкрыўшы свае памылкі, павінен паставіць перад сабой задачу глыбокай тэарытычнай вучобы.

Крытыка па прынцыпе «бац у морду» — ня наша, непартыйная крытыка. І ўсякае праяўленьне падобных паскокаў павінна перасякацца ў корані. Задачы, пастаўленыя лістом тав. Сталіна, задачы, што стаяць перад пралетарскім літаратурным рухам, патрабуюць значнага ўзмацненьня барацьбы за партыйнасьць нашай крытыкі. «У процівагу буржуазным норавам, у процівагу буржуазна-прадпрыемчаму гандлярскаму друку, у процівагу буржуазнаму літаратурнаму кар'ерызму і індывідуалізму, дарскаму анархізму і пагоні за нажывай — с

Выступленьне т. Літвінава на канфэрэнцыі па „раззбраеньні“

ЖЭНЭВА, 12. На ранішнім пасяджэньні генэральнай камісіі, якое пачалося дыскусіяй аб першым артыкуле праекту канвэнцыі, выступіў з прамовай тав. Літвінаў. Спасылаючыся на ўнесеную ім папраўку да першага артыкулу праекту канвэнцыі, тав. Літвінаў расткуў мачвае сэнс гэтай папраўкі, спыняючыся ня толькі на самым артыкуле, але і на далейшым развіцьці і ўдакладненьні гэтага артыкулу, як гэта мысьліцца савецкай дэлегацыяй.

— Мне здаецца, — кажа Літвінаў, — што сваімі папраўкамі заявамі на пленуме канфэрэнцыі і генэральнай камісіі я з выстарчальнай яснасьцю паказаў напрамак, па якім ідуць намаганьні савецкай дэлегацыі. Гэтыя намаганьні маюць адну мэту, а імянна — мэту сапраўднай арганізацыі трывалага міру паміж народамі і пазбаўленьня дзяржаў магчымасьці весьці паміж сабою вайну. Маючы на ўвазе гэту мэту, савецкая дэлегацыя ўнесла прапанову аб поўным раззбраеньні, якое, аднак, канфэрэнцыяй адхілена. Яна адхіліла ад сябе задачу, вырашэньне якой зрабіла - б канфэрэнцыю сапраўды эпохальнай і выдзеліла-б яе з усіх міжнародных канфэрэнцый, якія калі небудзь існавалі, а галоўнае адказвала - б патрабаваньням і надзеям народаў.

Канфэрэнцыя, пачынаючы цяпер новы этап сваёй работы, ставіць сабе непамерна больш скромную задачу, задачу частковага раззбраеньня. Я ўжо меў выпадак давесьці, што ніякае скарачэньне ўзбраеньняў ян колькаснае, так і якаснае ня можа мець сваім вынікам зьнішчэньне ці адмаўленьне ад вайны.

Але гэта ня прымусіць, аднак, савецкую дэлегацыю пры абмеркаваньні ўжо канкрэтных пытаньняў хоць - бы частко вага скарачэньня ва ўзбраеньнях трацінь з пад увагі асноўную мэту, якую яна ставіць сабе, а імянна хутчэйшае і найбольш эфэктыўнае стварэньне хаці-б адносная бясьпечнасьці супроць вайны. З гэтага пункту гледжаньня савецкая дэлегацыя можа прапанаваць толькі такое скарачэньне ўзбраеньняў, якое-б магло лічыцца пачаткам і перцым істотным этапам поўнага раззбраеньня з тым, каб іншыя этапы сьледвалі пасьля мінімальных інтэрвалаў. Савецкая дэлегацыя прымушана рашуча пярэчыць супроць магчымых спроб, а ў гэтых спробах здаецца недахопу ня будзе, да звужваньня задачы канфэрэнцыі да абмежаваньня ўзбраеньняў.

Лімітацыя ўзбраеньняў адхіляецца савецкай дэлегацыяй ужо таму, што яна ня толькі не зьяўляецца крокам наперад па шляху раззбраеньня, але і ні ў якай меры не зьмяншае ні магчымасьцяй, ні жахаў вайны. Лімітацыя ўзбраеньняў на існуючым узроўні магла-б пры пэўных умовах адбіцца на абмежаваньні ваенных бюджэтаў. Аднак, і гэта вельмі сумнявальнае абмежаваньне было - б дасягнута пры значнай колькасьці дадатковых умоў (зьнішчэньне сакрэтных фондаў на ўзбраеньні, скасаваньне выдаткаў на ўзбраеньні з бюджэтаў грамадзянскіх міністэрстваў і г. д.) Але мы не павінны забываць, што мы знаходзімся не на эканамічнай канфэрэнцыі, а на канфэрэнцыі па раззбраеньні якая павінна ставіць сабе зусім іншыя мэты, чым бюджэтную эканомію. Між іншым эканамічны крызіс і фінансавае становішча, якія перажываюць большасьць дзяржаў, самі і без таго ставяць межы далейшаму павышэньню ваенных бюджэтаў, у асаблівасьці ў тых выпадках, калі дзяржава ўжо цяпер траціць на ваенныя патрэбы 15, 30 і нават 50 проц. сваіх агульна дзяржаўных бюджэтаў.

На падставе ўсіх гэтых меркаваньняў савецкая дэлегацыя прапануе раз і назаўсёды пакончыць з эківокамі, што выцякаюць з адначасовага ўжываньня тэрмінаў «лімітацыя» і «скарачэньне». Скарачань — значыць, таксама лімітаваць, але лімітаваць ня значыць скарачаць. Вось чаму мы прапануем у далейшым карыстацца на канфэрэнцыі толькі тэрмінам «скарачэньне» і ўжываць толькі гэты тэрмін у першым артыкуле канвэнцыі і ва ўсім тэксьце канвэнцыі.

Але ня ўсякае скарачэньне заслугоўвае гэтай назвы. Неабходна такое скарачэньне, якое - б усе зразумелі, як сапраўдны пачатак раззбраеньня. Неабходна такое скарачэньне, якое адчупі-б ня толькі міністры фінансаў і плацельшчыкі падаткаў, але і генэральныя штабы. Неабходна такое скарачэньне, якое перабытала - б усе карты генэральных штабаў і прымусіла - б іх перагледзець усе свае стратэгічныя пляны і якое, такім чынам, затрудніла - б хаця -б на бліжэйшыя годы падрыхтоўку і вядзеньне войнаў.

На першы погляд можа здацца нават дзіўным, што мы прапануем урадам затрудніць работу ўласных органаў. Але гэта дзіўнасьць, на жаль, выцякае з супярэчлівага становішча, якое атрымалася дзякуючы таму, што, з аднаго боку, усе дзяржавы заяўляюць аб сваёй алданасьці справе міру і фармальна адмаўляюцца ад вайны ў якасьці зброі нацыянальнай палітыкі (а ні для чога іншага войны паміж народамі да гэтага часу не вяліся), а з другога боку — гэтыя-ж дзяржавы адмаўляюцца ад зьнішчэньня армій, існуючых толькі для мэт вайны. Пры гэтых абставінах нам прыходзіцца рабіць урадам прапановы, наколькі яны на тых ці іншых меркаваньнях адмаўляюцца ад зьнішчэньня армій, пры намсі прыняць меры для затрудненьня вайны, калі яны сапраўды вайны ня хочуць. Імянна таму мы налягаем на такім скарачэньні ўзбраеньняў, якое - б закранула ўсе абсалютна яго элемэнты. Скарачэньне гэта павінна пашырыцца на агульны лік армій, на войскі, размешчаныя ў мэтраполіі і калёніях, на колькасьць арганізаваных вайсковых злучэньняў, на абучаныя рэзэрвы.

Гэта скарачэньне колькасьці павінна злучацца з простым скарачэньнем усіх відаў матар'яльнай часьці і баявых прыпасаў. Адсюль выцякае нама другая прапанова канфэрэнцыі — пастанавіць ня толькі аб скарачэньні ўзбраеньняў, але і аб істотным скарачэньні іх.

Перад намі, аднак, паўстае пытаньне аб мэтадах скарачэньня. Гэтых мэтадаў, на мой погляд, толькі два. Першы заключаўся - б у тым, каб устанавіць індывідуальна для кожнай дзяржавы лічбовае або процантнае скарачэньне ўзброеных сіл з улікам не геаграфічнага палажэньня, ліку насельніцтва, даўжыні межаў і мноства іншых фактараў, якія абагульваюцца звычайна словам «бясьпечнасьць». Калі прыняць пад увагу, што такога роду пытаньні ня могуць вырашацца большасьцю галасоў і што неабходна згода ўсіх зацікаўленых у кожным асобным выпадку дзяржаў, дык стануць зусім відавочнымі непрактычнасьць і неажыцьцёўнасьць гэтага мэтаду. Цижка і нават немагчыма ўявіць сабе згоду паміж усімі прадстаўленымі на канфэрэнцыі дзяржавамі на глебе такога індывідуальнага ўстанаўленьня ўзброеных сіл для ўсіх 64 дзяржаў. Я ўжо не гавару аб тым, што канкрэтная выпрацоўка такога мэтаду скарачэньня патрабавала - б у лепшым выпадку некалькіх год работы, прычым нямінуча выступілі - б наверх з асаблівай сілай усе супярэчнасьці, якія існуюць паміж асобнымі дзяржавамі і групамі дзяржаў. Гэта наўрад ці спрыяла-б стварэньню мірнай атмасфэры на канфэрэнцыі. Я павінен атаварыцца, што, выказваючыся супроць індывідуальнага мэтаду скарачэньня, савецкая дэлегацыя зусім ня кіруецца эгаістычнымі нацыянальнымі інтарэсамі. Калі - б яна імкнулася да зьмены суадносін узбраеньняў у карысьць дзяржавы, якая прадстаўляецца ёю, дык яна нічога лепшага не жадала-б, як скарачэньне на аснове ўліку фактараў бясьпечнасьці.

У гэтым выпадку вам усім зусім зразумела, што мне было-б ня цяжка даказаць на аснове фактараў даўжыні межаў, ліку насельніцтва, адсутнасьці ваенных саюзаў, варожых адносін іншых дзяржаў і сеткі шляхоў зносін неабходнасьць не зьмяншэньня, а павялічэньня абароназдольнасьці краіны, якая мною прадстаўляецца, у асаблівасьці ў сучасны момант, з прычыны магчымай небясьпекі, з якой можа быць зьвязана для маёй краіны шпаркае разьвіцьцё падзей на Далёкім Усходзе. Савецкая дэлегацыя на канфэрэнцыі бачыць сваю задачу ня ў гэтым, а ў знаходжаньні такога мэтаду скарачэньняў, які не зьмяняў-бы існуючых суадносін сіл, быў-бы абэктыўна справядлівы і таму выклікаў-бы паменш спрэчак. Такім мэтадам можа быць толькі мэтад прапарцыянальнага скарачэньня ўзбраеньняў. Толькі такі мэтад не павядзе ніякай страты і не прынясе ніякай выгады ні адной дзяржаве. Суадносіны сіл застануцца ранейшымі, а выігрыш будзе агульны, адназкавы для ўсіх ад павялічэньня ўсагульнай бясьпечнасьці, з прычыны памяншэньня магчымасьці вайны і папутна ад скарачэньня ваенных расходаў.

Мне скажуць, ды мне ўжо і гаварылі ў падрыхтоўчай камісіі, што такі мэтад узаконіць і ўвекавечыць існуючыя няроўнасьці і несправядлівасьці ва ўзбраеньнях. Што існуе шмат несправядлівасьцяй на сьвеце, мы не адмаўляем, але ў той-жа час мы ня бачым магчымасьці на гэтай, або на якой-небудзь іншай кан фэрэнцыі выправіць усе гістарычныя несправядлівасьці і зьнішчыць існуючыя паміж дзяржавамі супярэчнасьці. Будзем па меншай меры спадзявацца, што пры скарачэньні ўзбраеньняў ня будуць яшчэ больш паглыблены несправядлівасьці, якія ёсьць у разьмеркаваньні ўзбраеньняў. І так, трэцяя прапанова, якая выцякае са сказанага мной, ёсьць прапарцыянальнае скарачэньне ўзбраеньняў. Мы лічылі-б, аднак, несправядлівым абсалютна строгае правядзеньне прынцыпу прапарцыянальнасьці і адпалькавае ўжываньне яго да ўсіх дзяржаў як надавычай магутным, так і найбольш слабым.

Таму мы знаходзім магчымасьць дапусьціць дыфэрэнцыяванае ўжываньне прынцыпу прапарцыянальнасьці і падзяляем дзяржавы на тры групы. Да першай групы мы адносім дзяржавы, якія маюць армії лікам ня вышэй 30 тыс., якія могуць быць зусім вызваленымі на бліжэйшы час ад скарачэньня. Да другой групы адносяцца дзяржавы з арміямі, лікам ад 30 тыс. да 200 тыс. чалавек, якія павінны скарачаць свае арміі ў прагрэсіўнай прапорцыі, згодна прадстаўленай савецкай дэлегацыяй дыяграме. Напрыклад, армія ў 50 тыс. чал. павінна будзе скарацціца прыблізна на 5 проц., армія ў 100 тыс. чал. — на 20 проц., у 150 тыс. чал. — на 35 проц., у 170 тыс. чал. — на 40 проц. і г. д. Да трэцяй групы адносяцца дзяржавы з сухаземнымі арміямі, лікам у 200 тыс. чалавек і вышэй, якія падлягаюць скарачэньню на 50 проц.

Вы бачыце, што пры выбраных намі лічбах армія дзяржавы, якая прадстаўляецца намі, нападае ў катэгорыю падлягаючых найбольшаму скарачэньню — у 50 проц.

Я гэтым зусім не хачу сказаць, што армія савецкай дзяржавы, як лікам вялікая таксама зьяўляецца агрэсіўнай пагрозай, як арміі вялікіх імпэрыялістычных дзяржаў. Зусім не, бо савецкая дзяржава не прасьледуе і па самой сваёй прыродзе ня можа мець на мэце ніякіх імпэрыялістычных мэт, ня імкнецца да завалаваньня новых тэрыторый і калёній, ня шукае мандатаў над чужымі тэрыторыямі, не пасылала і не пасылае сваіх войск на чужыя тэрыторыі для абароны сваіх грамадзян, або так званых нацыянальных інтарэсаў. Я толькі па абэктыўнай матэматычнай прымеце ўключаю маю краіну ў групу дзяржаў, арміі якіх падлягаюць максымальнаму скарачэньню.

Я гаварыў аб сухаземных арміях, але той-жа прынцып з другімі лічбамі мы кладзем у аснову скарачэньня морскіх і паветраных сіл па аднаведнай схэме, прыкладзенай да памянёнага мною дакументу.

Прыхоячы прынцып роўнасьці для ўсіх дзяржаў, намі прапануецца «пазьнь» з прапанаванай намі схэмы скарачэньня дзяржаў, узброеныя сілы якіх падпадаюць скарачэньню на аснове міжнародных дагавораў і якія ў далейшым павінны быць вызначаны на агульных для ўсіх краін падставах.

Я мог прападзіваваць толькі два маёй мастімі ў падрыхтоўчай камісіі, хаця тады скарачэньняў: адзін, які меркаваў-і не ўвасаблёны яшчэ ў фармальнай прапанове — індывідуальны мэтад і другі, які прапануецца савецкай дэлегацыяй. Я не забыў, зразумела, вельмі цікавай прапановы, унесенай на канфэрэнцыі турэцкай дэлегацыяй, да якое мы вернемся пасьля таго, як мы выслухаем разгляданьні турэцкай дэлегацыі. Дадаю толькі, што пасьлядоўнае прымяненьне прагрэсіўнай прапарцыянальнасьці можа ў поўны момант прывесьці да роўнасьці, якая прапануецца турэцкай дэлегацыяй, што значна зблізіце сазсцкую і турэцкую прапановы.

У аднаведнасьці са сказаным мною савецкая дэлегацыя і прапануе — прыняць першы артыкул праекту канвэнцыі ў наступнай рэдакцыі:

«Высокія бакі, якія дагаворваюцца, абавязваюцца ажыцьцявіць істотнае скарачэньне зараз існуючых узбраеньняў па прагрэсіўна-прапарцыянальным мэтадзе, як гэта прадугледжана дадай канвэнцыяй».

Гэты артыкул мае на мэце колькаснае скарачэньне ўзбраеньняў, але ён зусім не выключае і якаснага скарачэньня, або зьнішчэньня ўзбраеньняў. Ён такім чынам ніколькі не знаходзіцца ў супярэчнасьці з прапановамі, якія былі прадметам дыскусіі на ўчарайшым пасяджэньні генэральнай камісіі (тав. Літвінаў мае на ўвазе амэрыканскія прапановы). Я, карыстаюся выпадкам, каб адзначыць, што ня маю ніякіх пярэчаньняў супроць гэтых прапаноў тым больш, што яны былі зроблены самой савецкай дэлегацыяй яшчэ ў падрыхтоўчай камісіі. Унесены ёю праект канвэнцыі прадугледжваў поўнае зьнішчэньне як газаваў вайны, так і танкаў, а што датычыць цяжкай артылерыі, то мы прапаналі скасаваць яе калібрам звыча ніжэй 150 мм.

Мы і цяпер будзем прапаноўваць зьнізіць калібр тым больш, што ўжо ў сучасны момант у ваеннай літаратуры мож на знайсьці амісанне гармат у 155 мм., якія могуць біць на адлегласьці 26 клм., выкідваючы знарады вагой у 50 кгр. У нашых прапановах, аднак, скасаваньне цяжкай артылерыі, танкаў і газаў не стаяла ізаляванa, а спалучалася са скасаваньнем таксама і іншых відаў зброі нападу і агульным скарачэньнем усіх узброеных сіл і матар'ялаў.

Я хачу зьвярнуць увагу камісіі на адносьнасьць разуменьня бясьпечнасьці. Мне прадстаўляецца наогул небясьпечным аргумэнтаваць ад бясьпечнасьці ў карысьць тэй ці іншай прапановы аб скарачэньні ўзбраеньняў, бо мы даволі бачылі і ў падрыхтоўчай камісіі, і на цяперашняй канфэрэнцыі, як палобныя аргумэнты выкарыстоўваюцца супроць усякага зьнішчэньня і нават скарачэньня ўзбраеньняў.

Генэральная камісія як быццам паграшыла пасьля вялікодшага перапынку заняцца шчыльна пытаньнем раззбраеньня. Яна павінна цяпер апраўдаць выданы ёю вэксаль, але яна гэта зробіць толькі тады, калі яна прыступіць да вырашэньня асноўных вялікіх пытаньняў раззбраеньня. Трэба прызнаць, што першыя два месяцы канфэрэнцыя толькі хадзіла вакол гэтых пытаньняў. Яна вырашыла адно толькі вялікае пытаньне аб поўным раззбраеньні, але на жаль, адмоўна. Перад канфэрэнцыяй стаіць цяпер пытаньне таксама вялізарнай важнасьці, і яна павінна даць на яго адказ, а імянна на пытаньне — ці згодны прадстаўленыя дзяржавы хоць частко ва скарацціць і істотна скараціць свае ўзбраеньні? Калі адказ будзе адмоўны, дык няўдачу канфэрэнцыі нельга захаваць ніякімі пабочнымі рэзалюцыямі і пастановамі аб «маральным раззбраеньні», аб бясьпечнасьці і нават аб скасаваньні таго ці іншага віду зброі. Калі-ж наадварот, праблема істотнага скарачэньня ўсіх узбраеньняў і па спосабе, якім яно не прынясе страты ніякай дзяржаве, будзе вырашана станоўча, дык добрая воля дзяржаў будзе пралулена ў выстарчальнай ступені, каб вырашэньне пашутна ўзьнікшых тут другарадных задач не прадстаўляла ніякіх затруднеў».

Агляд друку

Актывізавацца ў барацьбе за суцэльную пісьменнасьць

(„Прамень камунізму“—Шклоў, „Калгасьнік Мазыршчыны“—Мазыр)

З кожных дзесяці—сем пісьменных Семдзесят з сотні. З тысячы — семсот. 70 проц. усяго насельніцтва старой Беларусі не маглі расьпісацца. Так трэба было для царызму і капіталістаў...

Савецкая Беларусь — у мінулым тая краіна, дзе з кожнай сотні людзей толькі трыццаць ведалі літары, — першая ў Савецкім Саюзе ўвяла ўсеагульнае навучаньне і ажыцьцяўляе найвялікшую задачу — да 1-га мая 1932 г. стаць суцэльна пісьменнай.

Праробленa вялізарная, магчымая толькі ў краіне дыктатуры пралетарыяту, работа. З кожных дзесяці ўжо стала восем пісьменных. Ёсьць усе ўмовы, каб 1-га мая гэтага году мы сьвяткавалі новую буйнейшую перамогу ленінскай нацыянальнай палітыкі і культурнай рэвалюцыі — завяршэньне ліквідацыі пісьменнасьці.

Як-жа змагаецца наш раённы друк за ліквідацыю пісьменнасьці?

Мы ўзялі дзьве газэты тых раёнаў, у якіх ліквідацыя пісьменнасьці зьяўляецца асабліва вузкім месцам.

***

Шклоўская газэта «Прамень камунізму» ў нумары за 8 сакавіка канстатуе

«НАЯЎНАСЬЦЬ ВЯЛІЗАРНЕЙШЫХ ПРАРЫВАЎ у ліквідацыі пісьменнасьці па нашым раёне».

Ніжэй газэта паведамляе, што 4.100 чалавек пісьменных яшчэ не ахоплены ліквпунктамі. А там, дзе

«пісьменная і ахоплены ліквпунктамі, культае наведваньне, якасьць работы — няма плянавасьці, пісьменныя навучаюцца разам з малапісьменнымі. У выніку нярэдкі выпадкі, калі скончыўшыя ліквпункт у мінулым годзе падлягаюць ліквідацыі пісьменнасьці і ў гэтым годзе».

Так стаіць справа з ліквідацыяй пісьменнасьці ў Шклоўскім раёне. Што-ж робіць пасьля гэтага сам «Прамень камунізму», як ён змагаецца, каб справу рашуча паленшыць?

На працяту студзеня і лютага газэта зусім абыходзіла важнейшы вучастак культурнай рэвалюцыі — ліквідацыю пісьменнасьці. У апошнім нумары за люты месяц і ў сакавіку «П. К.» даў толькі тры выпадковыя падборкі. Матар'ялы падборак носяць самы агульны рэгістратарскі характар. Газэта толькі спакойна фіксуе, што

«... трыкутнік фабрыкі «Спартак» ня пічыць сваёй справай ліквідацыю пісьменнасьці сярод работных»,

альбо паведамляе пра тое, як

«настаўнік Радзішчанскай школы Качароўскі 18-га студзеня не пайшоў на ліквпункт, а з членам сельсавету Фэкціставым С. наліўся да п'яна, пасьля чаго зьявіўся на вячорку, дзе і згубіў галёшы, шапку і грошы».

І ўсё. «Прамень камунізму» ня робіць ніякіх вывадаў, не патрабуе суровых мер да зрыўшчыкаў работы. Газэта ўсю віну бачыць толькі ў тым, што

«... райпалітінспэктура не забясьпечыла штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва».

і не мабілізуе ўсе арганізацыі раёну і ў першую чаргу партыйныя ячэйкі, прафсаюзы, камсамол на завяршэньне ліквідацыі пісьменнасьці. «П. К.» не ўзначаліў, не разгарнуў масавай работы па ператварэньні Шклоўшчыны ў суцэльна пісьменны раён.

Нават тады, калі ўжо ў красавіку месяцы на папыраным прэзыдыуме тарсавету былі выкрыты выключныя факты зрыву работы па ліквідацыі пісьменнасьці, выяўлены канкрэтныя зрыўшчыкі, «Прамень камунізму» абмяжоўваецца маленькім допісам пад такой пасыўнай і шаблённай шапкай

«... гаспадарнікі і ФЗМК павінны павярнуцца тварам да ліквбезу».

Газэта піша аб тым, што па фабрыцы «Спартак» са 100 пісьменных і малапісьменных наведваюць ліквпункт толькі 8-10 чалавек, але зноў ня робіць адсюль ніякіх палітычных вывадаў. І гэта ў той час, калі да першага мая застаюцца лічаныя дні.

***

Мазыр увесь час ідзе ў рабоце па ліквідацыі пісьменнасьці на адным з апошніх месц. На 1 красавіка было ахоплена навучаньнем толькі 64 проц. пісьменных. А ў такіх сельсаветах, як Церабаўскі, Дуброўскі, Даманавіцкі, Бабровіцкі, Бабрыняцкі і інш., ліквпунктамі ахоплена менш за 50 проц. За сакавік месяц ахоп пісьменных ліквпунктамі павялічыўся толькі на 4 проц.

«Калгасьнік Мазыршчыны» фармальна, быццам, аддае ўвагу рабоце па ператварэньні раёну ў суцэльна пісьменны. Так, за час з 31 студзеня па 5 красавіка (на працяту 27 нумароў газэты) па гэтым пытаньні дана 10 падборак. І ўсё-ж «К. М.» СЛАБА змагаецца за суцэльна пісьменную Мазыршчыну. Культпроп ЦК КП(б)Б у сьнежні мінулага году ў спэцыяльнай пастанове аб «К. М.» завастрыў увагу на тым, што:

«газэта ў радзе выпадкаў стала на шлях недапушчальнага для пралетарскай газэты мэтаду паднясеньня матар'ялаў, калі зьмешчаныя загалоўкі аддзелаў газэты не падмацоўваюцца адпаведнымі матар'ялам ў зьмесьце гэтых аддзелаў».

Пасьля гэтай пастановы газэта дабілася некаторага паляпшэньня ў сваёй рабоце. Але і цяпер яшчэ часам актуальныя, актыўныя загалоўкі аддзелаў газэты не падмацоўваюцца адпаведным актыўным тэкставым матар'ялам.

Напрыклад, у № 34 «К. М.» дае такі загаловак.

«Выправім недахопы ў працы ліквпунктаў, ператорым Мазыр да 1-га мая ў горад суцэльнай пісьменнасьці».

У тэксьце-ж газэта ня ставіць ніякіх канкрэтных задач. Па гораздзе не займаюцца 270 чалавек пісьменных. Газэта не дабіваецца таго, каб іх абавязкова ахапіць ліквпунктамі. «К. М.» нездавальняюча апэрацыйна кіруе гэтай работай, не паказвае ў далейшым, што-ж робіцца, каб 270 чалавек навучыць пісьменнасьці.

У падборцы за 20 сакавіка «К. М.» пісаў:

«Значная частка партыйных, камсамольскіх ячэек і сельсаветаў па-апартуністычнаму адносяцца да ліквідацыі пісьменнасьці, лічаць гэту працу другарадная, лічаць, што за зрыў ліквідацыі пісьменнасьці да адказнасьці ня прыцягнуць».

Просты абавязак газэты — выкрыць посьбітаў гэтых да канца апартуністычных настрояў, завастрыць увагу на ўказаньні ЦК КП(б)Б аб тым, што за ліквідацыю пісьменнасьці нясуць поўную адказнасьць партыйныя арганізацыі і ячэйкі. «К. М.» гэтага ня робіць. Газэта аб'ектыўна патурае дэмабілізацыйным настроям.

З 1 красавіка па 1 мая мазырскім райкомам КП(б)Б абвешчан месячнік штурму прарываў у ліквідацыі пісьменнасьці. «К. М.» абавязан узначаліць гэты штурм, мабілізаваць на яго правядзеньне ўсю савецкую грамадзкасьць. Трэба з нумару ў нумар даваць паказ ходу штурму. Трэба сваячасова сыгналізаваць і прымаць канкрэтныя захады па ліквідацыі вузкіх месц. На сёньняшні дзень Мазырскі раён зьяўляецца, бадай, самым слабым зьвяном у агульным фронце змаганьня за суцэльна пісьменную Беларусь, месячнік штурму павінен прынесьці перамогу. Мазыршчына, як і ўсе іншыя раёны, абавязана завяршыць ліквідацыю пісьменнасьці.

***

Сакавіцкі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б указаў, што ёсьць усе ўмовы, каб БССР да 1 мая стала рэспубліканскай суцэльнай пісьменнасьці. Раённаму і пізаваому друку і ў першую чаргу газэтам адстаючых раёнаў, трэба ў значна большай ступені актывізаваць сваю работу, капчаткова разьбіць тыя настроі, што «за зрыў ліквідацыі пісьменнасьці да адказнасьці ня прыцягнуць».

Да 1 мая дырэктыва партыі і ўраду павінна быць цалкам выканана. БССР будзе рапартаваць усяму Савецкаму Саюзу аб завяршэньні суцэльнай пісьменнасьці.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

„Ніякі міжнародны кантроль для Амэрыкі непрыстасоўны“

Першае пасяджэньне канфэрэнцыі--пад знакам рэзкай сутычкі французкіх і амэрыканскіх інтарэсаў

ЖЭНЭВА, 12. (Спэцкор ТАСС). Адначыньне «работ» канфэрэнцыі па «раззбраеньні» пачалося пасяджэньнем генэральнай камісіі. ПЕРШАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПРАЙШЛО ПАД ЗНАКАМ ДАВОЛІ РЭЗКАЙ СУТЫЧКІ ФРАНЦУСКІХ І АМЭРЫКАНСКІХ ІНТАРЭСАЎ, прычым амэрыканскі пункт гледжаньня быў падтрыман дэлегатам Англіі Саймонам.

Пасяджэньне генэральнай камісіі адкрылася прамовай старшыні канфэрэнцыі Гендэрсона, які, падагуліўшы «плённыя вынікі» першага пэрыяду канфэрэнцыі, заявіў, што зараз на чарзе абгаварэньне прынцыпаў і мэтадаў скарачэньня ўзбраеньняў. Гендэрсон напомніў аб прынятым 15 сакавіка вырашэньні, паводле якога генэральная камісія павінна засядаць да таго часу, пакуль ня прыдзе да прынцыповых вырашэньняў, якія дазваляюць весьці далей работу тэхнічным камісіям.

У спрэчках першым выступіў дэлегат ПАЗШ Гібсон. Гібсон пачаў з указаньня, што «большасьць унесеных на канфэрэнцыі прапаноў адлюстроўвае клопаты аб тым, як ажыцьцявіць абмежаваньне і скарачэньне ўзбраеньняў, не наносячы гэтым самым страту нацыянальнай бясьпечнасьці». Гэта бясьпечнасьць, паводле думкі Гібсона, адлюстроўвае страх перад магчымасьцю непрыяцельскага нападу і небясьпекі, што сродкі для гэтай абароны могуць быць невыстарчальнымі. Таму Гібсон лічыць, што пакольні агрэсіўнымі відамі ўзбраеньняў, якія палягчаюць напад, зьяўляюцца ТАНКІ, ПАЛЯВАЯ ЦЯЖКАЯ АРТЫЛЕРЫЯ, ГАЗЫ, то забарона ўжываньня іх узмацніць упэўненасьць у бясьпечнасьці.

Гібсон падкрэсьліў, што амэрыканская дэлегацыя наўмысьля ня ставіць пытаньне аб забароне наступальных відаў зброі ва ўсёй шырыні, бо «вопыт паказаў шкоду трактоўкі вельмі многіх праблем адразу» і што «таму трэба сканцэнтраваць увагу на найбольш вострай частцы праблемы бясьпечнасьці, зьвязанай з сухаземнай вайной».

Гібсон унёс рэзалюцыю, у якой прапануе даручыць камісіі па сухаземным узбраеньні выпрацаваць і прадставіць плян ЗЬНІШЧЭНЬНЯ ТАНКАЎ І ПАЛЯВЫХ ГАРМАТ ЗВЫШ 155 мм. І ЗАБАРОНЫ ЎЖЫВАНЬНЯ ГАЗАЎ. Далей рэзалюцыя прапануе даручыць палітычнай камісіі выпрацаваць формулу абавязацельстваў аб няўжываньні на вайне паказаных сродкаў.

ДЭЛЕГАТ АНГЛІІ САЙМОН ПАДТРЫМАЎ ГІБСОНА, указаўшы, што ангельскі ўрад яшчэ ў пачатку канфэрэнцыі выказаўся за забарону раду наступальных відаў зброі і таксама пічыць, што спачатку неабходна скараціць сухаземныя ўзбраеньні. ДЭЛЕГАТ ГЕРМАНІІ НАДОЛЬНЫ прапанаваў аб гаварыць амэрыканскі праект у сувязі з іншымі прапановамі, унесенымі раней, у прыватнасьці, германскімі і італьянскімі.

Выступленьне Гібсона СУСТРЭЛА РЭЗКАЕ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ З БОКУ ТАРД'е. ТАРД'е заявіў, што «французкія прапановы, унесеныя на канфэрэнцыі, ідуць значна далей прапановы Гібсона, бо яны прадугледжваюць скарачэньне таксама бамбардыровачнай авіяцыі, пінкораў звыш 10 тысяч тон і буйных падводных лодак».

«Апрача таго,—падкрэсьліў Тард'е,— французкія прапановы зьвязваюць гэту забарону са стварэньнем кантролю і ўстанаўленьнем санкцый супроць нападаючага боку ў духу Лігі нацый».

«Амэрыканская прапанова,—заявіў далей Тард'е,—накіравана выключна супроць сухаземных узбраеньняў і тым самым супярэчыць нязьменнаму французкаму тэзісу аб узаемазалежнасьці розных відаў узбраеньня».

Тард'е далей заявіў, што амэрыканская прапанова нялоўная па сваім аб'ёме і невыстарчальная, бо ня мае мантаў санкцый і кантролю і таму трэба перадаць прапанову Гібсона ў бюро канфэрэнцыі для ўстанаўленьня працэдуры абмеркаваньня аб узаемнай сувязі з усімі прапановамі, якія датычаць якаснага абмежаваньня ўзбраеньняў, г. зн. італьянскімі, германскімі і французкімі.

Італьянскі дэлегат Кавалера прапанаваў разглядаць прапанову Гібсона ў рамках італьянскага мэмарандуму аб якасным абмежаваньні ўзбраеньняў. Выступіўшы ў другі раз, Гібсон заявіў, што ён згодзен на тое, каб даручыць бюро канфэрэнцыі ўстанавіць працэдуру абмеркаваньня пытаньняў і зноў падкрэсьліў, што сваёй прапановай ён сьвядома імкнуўся ахапіць тоўкі частку агульнай праблемы.

ТАРД'е, выступіўшы другі раз, выказваючыся за перадачу прапановы Гібсона ў бюро канфэрэнцыі, падкрэсьліў, што «працэдурныя пытаньні часта на справе зьяўляюцца істотнымі пытаньнямі, бо зараз у наяўнасьці дзьве тэндэнцыі: адна—у духу даваенных гаагскіх канфэрэнцый, якая імкнецца забараніць паасобныя віды ўзбраеньня, і другая—французкая, якая імкнецца да зьвязаных вырашэньняў у духу Лігі нацый». У выніку спрэчак рэзалюцыя Гібсона перадана на абмеркаваньне бюро канфэрэнцыі.

Пасьля першага пасяджэньня генэральнай камісіі канфэрэнцыі па «раззбраеньні» Гібсон прыняў прадстаўнікоў друку. Гібсон, між іншым, катэгарычна заявіў, што «НІЯКІ МІЖНАРОДНЫ КАНТРОЛЬ ДЛЯ АМЭРЫКІ НЕПРЫСТАСОЎНЫ».

Саймон у гутарцы з прадстаўніком друку заявіў, што «да пасяджэньня генэральнай камісіі ён нічога ня ведаў аб прапанове Гібсона». Саймон указаў што «ангельскі ўрад сам ніадаўна абмеркаваў аналягічныя прапановы і ён поўнасьцю згодзен з прапановай Гібсона».

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

423 тоны чыгуну

КУЗЬНЕЦКАБУД, 11. 10 красавіка домна № 1 выплавіла 423 тоны ліцейнага чыгуну.

Новыя два цэхі беразьнікоўскага камбінату ўступілі ў эксплёатацыю

БЕРАЗЬНІКІ, 11.

10 красавіка пушчаны ў работу яшчэ два цэхі аміячнага заводу. У 5 гадз. вечара канвэрсыйны газ падан у галоўны калектар кампрэсіі, а потым пасьля 30-мінутнага рэгуляваньня складу газу — у канвэртар № 3. У 5 гадз. 40 мін. газ паступіў у вадзяныя скрубэры ачысткі.

Першая савецкая печ для вырабу сынтэтычнага каўчука

ЛЕНІНГРАД, 11 красавіка. (Роста). Інжынэр Грум-Гржымайла распрацаваў канструкцыю першай савецкай печы для вырабу сынтэтычнага каўчука. Выпрабаваньні паказалі, што новая печ зьяўляецца буйнейшым дасягненьнем савецкай тэхнікі, яна поўнасьцю адпавядае патрабаваньням, якія прад'яўляюцца да печаў, неабходных для работы над сынтэтычным каўчуком.

Дакладная мэханіка

За пяцідзённку з 6 па 11 красавіка віцебская аркулярная фабрыка выпусьціла прадукцыі на суму 82.432 руб., або 117,8 проц. Аркуляраў выпушчана па суму 45.105 руб. — 132,8 проц., апраў на суму 18.298 руб.—125,5 проц.

На 1-ай БелДРЭС

9 красавіка 1-я БелДРЭС выпрацавала 170.000 кілёват-гадзін. Максымум дасягнуў 9.100 кілёват, мінімум—6.000 кілёват і сярэдняя — 7.100 клв.

10 красавіка 1-я БелДРЭС выпрацавала 163 тыс. кілёват-гадзін. Максымум дасягнуў—9.000 кілёват, мінімум—6.000 кілёват і сярэдняя — 6.700 кілёват.

Будматар'ялы

9 красавіка дрэваапрацоўчы камбінат «Камінтэрн» расьпілаваў 236,2 кбм. сырцу, або 95,7 проц. Фанэры выпушчана 39,3 кбм., або 79,6 проц. Цэх гнутай мэблі выпусьціў 138 адзінак, або 95,9 проц.

***

8 красавіка завод «Інтэрнацыянал» выпусьціў 894,3 кгр. буцаўнічых вінтоў, або 84,06 проц.

9-га выпушчана 798 кгр. буцаўнічых вінтоў, або 76,64 проц.

***

Завод «Чырвоны Кастрычнік» за першую дэкаду красавіка выпусьціў прадукцыі на суму 21.607 руб., або 9,3 проц. месячнага пляну, у тым ліку буцаўнічых цьвікоў выпушчана 2,7 тоны, або 1,45 проц. месячнага пляну. Невыкананьне праграмы тлумачыцца адсутнасьцю дроту-катанкі.

Скура

Магілеўская гарбарня імя Сталіна за другую пяцідзённку красавіка выпусьціла прадукцыі на суму 82.870 р., або 124,4 проц.

***

Віцебская гарбарня за 10 дзён красавіка выпусьціла прадукцыі на суму 150.924 руб., або 81,1 проц. пляну, у тым ліку чырвонадубны цэх выпусьціў прад